№ 14 (516) 20 красавіка 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднаўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## У НУМАРЫ


### АЭС паўстане сярод балотаў

Рэпартаж зь вёсак на сутыку Быхаўскага і Чавускага раёнаў, дзе будуецца беларуская АЭС. **Старонка 17.**

### Брыгаднікі

...І вось ужо легенда беларускага Адраджэньня называе іншага палітыка «мразьзю». Тыдзень у камэнтары Віталя Тараса. **Старонка 8.**

### Апакаліпсіс пачынаецца

Зьнікнуць лядовыя шапкі Арктыкі, Антарктыды, засухі і паводкі зьменяць аблічча Зямлі. **Старонка 14.**


## Эўра–2012: «Вось чаго можа дабіцца краіна, дзе ледзь не штогод адбываюцца рэвалюцыі»

У сераду выканаўчы камітэт УЭФА прыняў рашэньне, што чэмпіянат Эўропы па футболе 2012 пройдзе на палях Польшчы і Ўкраіны. Як Эўра–2012 адаб'ецца на Ўкраіне і Беларусі?

Права прымаць чэмпіянат Эўропы па футболе 2012 г. прысуджана Ўкраіне й Польшчы. Пра гэта абвясьціў старшыня ЎЭФА Мішэль Пляціні на цырымоніі ў сталіцы Валіі Кардыфе.

«Незалежная Ўкраіна нарадзілася 15 гадоў таму. У нас цяпер зьявіўся шанец, гэта новы выклік лёсу, — сказаў адразу пасьля абвяшчэньня вынікаў галасаваньня старшыня Фэдэрацыі футболу Ўкраіны Рыгор Суркіс.

Супернікамі Ўкраіны ды Польшчы на апошнім этапе былі Італія, а таксама Харватыя і Вугоршчына. На першым этапе былі адсеяныя заяўкі Турэччыны ды Грэцыі.

**Працяг на старонцы 2.**



# Цэнтар цяжару

**Павал Севярынец: Сёньня гэта кляштар бэрнардынаў. Старонка 12.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Эўра-2012: «Вось чаго можа дабіцца краіна, дзе ледзь не штогод адбываюцца рэвалюцыі»

**Працяг са старонкі 1.**

Як ведама, на прыняцьці рашэньня ў сераду ўлічваліся перадусім рэкамэндацыі камітэту ЎЭФА ў нацыянальных зборных ды адмысловая справаздача ЎЭФА, што дае ацэнку транспартнай сыстэме, інфраструктуры, праўным аспэктам, умовам жыцьця і бясьпекі.

Лёс чэмпіянату Эўропы 2012 г. вызначалі 12 чалавек. Акрамя Пляціні, гэта прадстаўнікі Нямеччыны, Турцыі, Нарвэгіі, Гішпаніі, Ангельшчыны, Галяндыі, Кіпру, Мальты, Партугаліі, Румыніі й Расеі.

Украіна і Польшча атрымалі сем галасоў з дванаццаці, перамогшы ў першым туры галасаваньня.

Расейскі футбольны саюз плянуе падаць заяўку на правядзеньне чэмпіянату Эўропы ў 2016 г., і атрыманьне права на яго ў 2012 г. Украінай і Польшчай зьніжае шанцы Расеі.

Украіна ж атрымала чэмпіянат Эўропы, нягледзячы на палітычную барацьбу ў гэтай краіне.

Напярэдадні ж, падмацоўваючы польска-ўкраінскую заяўку, прэзыдэнт Украіны Віктар Юшчанка заявіў, што з аптымізмам глядзіць на вырашэньне задачаў, што стаяць перад краінай, у сьвятле чэмпіянату.

«Запэўніваю вас, празь пяць гадоў Украіна і Польшча зробяць тое, што пры іншых абставінах ня здолелі б зрабіць і за паўстагодзьдзя. Дзеля гэтае ідэі аб’ядналіся ўсе — простыя людзі, бізнэсоўцы, палітыкі».

У Польшчы матчы маюць прайсьці ў Гданьску, Познані, Варшаве і Ўроцлаве, а ва Ўкраіне — у Кіеве, Данецку, Днепрапятроўску і Львове.

**РМ; паводле gazeta.ru**

## Камэнтары

**Багдан Арлоў, заўзятар, аўтар беларуска-расейскага слоўніка спартовых тэрмінаў:** «Найперш хацелася б павіншаваць нашых суседзяў. Спадзяюся, што калісьці й мы аб’яднаем намаганьні з Балтыяй, каб правесьці такі турнір».

**Сяргей Аляхновіч, спартовы журналіст:** «Спадзяюся, між Беларусьсю і Ўкраінай да гэтага часу яшчэ ня будзе візавага рэжыму, і беларусы змогуць вольна паглядзець на эўрапейскіх зорак».

**Сяргей Канашыц, спартовы аглядальнік «Беларусь сегодня»:** «Гэта шыкоўна, што чэмпіянат пройдзе ва Ўсходняй Эўропе! Да Ўкраіны і пешшу можна прайсьціся. Таксама гэта дадатковы стымул для беларускіх футбалістаў трапіць на Эўра-2012. Відавочна, што гэта і палітычны крок. Гэта бонус для Ўкраіны за палітычныя падзеі, што там адбываюцца».

**Юры Чавусаў, палітоляг:** «Рашэньне выканаўчага камітэту ЎЭФА разьбівае ўшчэнт камэнтары нашага тэлебачаньня, што ў Эўропе нас ніхто не чакае. На поўнач ад Беларусі праходзіць чэмпіянат сьвету па хакеі



REUTERS

[Латвія-2006], балтыйскія краіны ўжо ў Эўрасаюзе, Украіна будзе прымаць чэмпіянат Эўропы па футболе і, напэўна, неўзабаве далучыцца да ЭС. А Беларусь... сядзіць з іміджам апошняй дыктатуры Эўропы».

**Сяргей Шчурко, журналіст газэты «Прессбол»:** «Радуюся, што ва ўкраінскай фэдэрацыі футболу хапіла розуму аб’яднаць свае намаганьні з Польшчай, каб правесьці Эўра-2012. Чамусьці ў беларускай фэдэрацыі такіх думак не ўзьнікала. Там увогуле рэдка калі думаюць. Для ўсёй Украіны гэта будзе моцны эмацыйны ўсплёск. Гэта прыклад таго, чаго можа дабіцца краіна, дзе ледзь не штогод адбываюцца рэвалюцыі, як кажуць па нашым тэлебачаньні».

**Апытваў Зьміцер Панкавец**

**ПРЭЗЭНТАЦЫЯ**




# Беларусь:
## ні Эўропа, ні Расея
Меркаваньні беларускіх эліт

**27 красавіка** (пятніца) у сядзібе БНФ «Адраджэньне» (вул.Варвашэні, 8) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі варшаўскага выдавецтва «ARCHE» **«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт».** Створанае з удзелам 30 палітычных, грамадзкіх і культурных дзеячоў Беларусі (Вольга Абрамава, Вячаслаў Кебіч, Аляксандар Мілінкевіч, Сяргей Касьцян, Валеры Фралоў, Усевалад Янчэўскі ды інш.), выданьне адлюстроўвае погляды беларускай эліты на пытаньне месца Эўропы і Расеі ў нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў. **Пачатак а 17.00.** Уваход вольны.

## Лукашэнку запрасілі на «Чарнобыльскі шлях»

Аргкамітэт «Чарнобыльскага шляху» запрасіў А.Лукашэнку прыняць удзел у жалобным мерапрыемстве, а таксама даць справаздачу аб ліквідацыі наступстваў катастрофы. Ліст падпісаў старшыня аргкамітэту прафэсар Іван Нікітчанка.

Арганізатары хочуць пачаць маніфэстацыю 25 красавіка а 18-й ад плошчы Якуба Коласа і скончыць яе мітынгам каля Нацыянальнай бібліятэкі. Адпаведная заяўка пададзеная ў гарвыканкам.

**МБ**

# Эўрапейцы прымірылі апазыцыю

У часе канфэрэнцыі «Пазытыўная альтэрнатыва для Беларусі й яе грамадзянаў», якая праходзіць у Вільні пад эгідай Рады Эўропы, лідэры апазыцыі прыйшлі да кампрамісу ў справе Кангрэсу дэмакратычных сілаў.

Вырашана правесьці Кангрэс дэмакратычных сілаў да канца вясны. Склад дэлегатаў Кангрэсу будзе пашыраны за кошт дэлегатаў першага Кангрэсу і вядомых асобаў. Паўнамоцтвы дэлегатаў, абраных шляхам збору подпісаў, будуць праверaныя спэцыяльнай камісіяй.

Кангрэсу будуць папярэднічаць сем рэгіянальных сходаў. На разгляд тых сходаў будуць прапанаваныя пытаньні, якія не змагла вырашыць пагаджальная камісія. Рашэньні гэтых сходаў будуць абавязковымі для ўсіх. У кожным зь іх будуць удзельнічаць 100-150 чалавек. Калі на чатырох зь сямі сходаў большыня вырашыць абраць новага лідэра (на гэтым настойвае Мілінкевіч), рашэньне будзе выкананае.

**Мікола Бугай**

# Ван дэр Ліндэн хоча чаго-небудзь дачакацца

«Цяпер чарга беларускіх уладаў прадэманстраваць сваё жаданьне стаць бліжэй да эўрапейскіх структур і Рады Эўропы, — заявіў у адказ на пытаньне агенцтва БелаПАН старшыня Парляменцкай асамблеі Рады Эўропы Рэне ван дэр Ліндэн 16 красавіка ў Страсбургу. — Пакажыце сваю добрую волю і сваё жаданьне стаць членам велізарнай эўрапейскай сям'і».

Ван дэр Ліндэн таксама нагадаў, што падчас візыту ў Менск у інтэрвію праграме «Панарама» ён меў магчымасьць «публічна выказаць сваё меркаваньне аб недапушчальнасьці наяўнасьці палітзьняволеных у краіне» і аб тым, што выбары «не былі свабоднымі і сумленнымі». Пры гэтым ван дэр Ліндэн прызнаў, што аўтары праграмы «трошкі маніпулявалі» пры перакладзе яго слоў з англійскай на расейскую. «Але тыя, хто разумее маю англійскую, маглі праслухаць інтэрвію ў арыгінале», — сказаў ван дэр Ліндэн.


Юлія Дарашкевіч

У арыгінале прамовы гучала выказваньне аб «зьняволеных, якія лічацца палітычнымі» («prisoners considered as political prisoners»), а ў перакладзе — аб «палітыцы прэзыдэнта».

### Мілінкевіч прапанаваў адкрыць Эўрапейскія цэнтры ва ўсіх ВНУ

На ягоную думку, Рада Эўропы і Эўрасаюз павінныя вылучыць беларускаму ўраду прапанову адкрыць у ВНУ такія офісы. На думку Мілінкевіча, яны могуць быць створаныя на ўзор Цэнтру эўрапейскай дакумэнтацыі ды інфармацыі пры БДУ, але ва ўсіх ВНУ Беларусі і каардынаваныя прадстаўнікамі Эўропы.

# «300 спартанцаў» у Беларусі забаранілі на просьбу Ірану



Амэрыканскі фільм «300 спартанцаў» Зака Снайдэра ішоў у Менску толькі два тыдні (ад 22 сакавіка да 5 красавіка) ў кінатэатрах «Кастрычнік», «Масква», «Аўрора» і прыносіў добрыя зборы. У іншых кінатэатрах гораду яго ня будзе — такое рашэньне прыняла экспэртная камісія пры Міністэрстве культуры. Рашэньне прымалася пры ўдзеле міністра Уладзімера Мацьвейчука, а інцыдэнт паўстаў у сувязі са зваротам іранскіх уладаў. Дэпутаты іранскага парлямэнту накіравалі ліст міністру замежных спраў з патрабаваньнем выразіць пратэст з нагоды паказу антыіранскага, на іх думку, галівудзкага фільму.

**АК**

## Заснаваная прэмія імя Вацлава Ластоўскага

Яе будуць уручаць беларускамоўным выкладчыкам ВНУ. Асноўнай мэтай гэтай прэміі будзе маральная падтрымка людзей, якія выкладаюць па-беларуску фізыка-матэматычныя, прыродазнаўчыя, юрыдычныя і іншыя дысцыпліны, якія рэдка ва ўнівэрсытэтах чытаюцца па-беларуску. У склад прэміяльнай рады ўвайшлі старшыня Таварыства беларускай школы Алесь Лозка, старшыня Асацыяцыі беларусістаў Сяргей Запрудзкі, Алена Макоўская, Лявон Баршчэўскі, Яраслаў Крывой, Віталь Алісёнак.

**Каб узяць удзел у конкурсе, трэба да 15 траўня падаць заяўку на e-mail: lastouski@gmail.com ці на паштовую скрынку: 220029 Менск, а/с 64. Форму падачы заяўкі можна знайсьці па і-адрасе: nastaunik.info/lastouski.**

## За перайменаваньне Сувораўскага

Група грамадзянаў выступіла з ініцыятывай перайменаваць Сувораўскае вайсковае вучылішча ў вучылішча імя Канстанціна Астроскага. Распачаты збор подпісаў пад пэтыцыяй на імя Сяргея Сідорскага і міністра абароны Леаніда Мальцава.

**МБ**

# Лукашэнка: «Буду рыхтаваць

**Аляксандар Лукашэнка** даў прэс-канфэрэнцыю для кіраўнікоў беларускіх СМІ. Яна праходзіла ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі, на яе было акрэдытавана 30 прадстаўнікоў прэсы, пераважна дзяржаўнай. Сэнсацый не прагучала. Найбольшай быў хіба ўдзел рэдактараў некалькіх недзяржаўных СМІ і магчымасьць для іх задаць пытаньні. Самай загадкавай фразай быў адказ на пытаньне пра пераемніка: «Што да пераемніка, то буду рыхтаваць самага маленькага унікальны расьце чалавек».

Напачатку А.Лукашэнка адзначыў, што па «пэўных прычынах» гэтая прэс-канфэрэнцыя адмянялася, і сказаў, што «прэзыдэнт абавязаны сустракацца з прадстаўнікамі прэсы». Ён пачаў прэс-канфэрэнцыю з заявы, што беларуская эканоміка пераадолела наступствы росту цэнаў на энэрганосьбіты. Далей былі нападкі на апазыцыю. З словаў А.Лукашэнкі, беларускае грамадзтва перайшло ў стадыю, калі «нашу стабільнасьць ніхто не зламае».

Ніякіх прынцыпова новых заяваў на прэс-канфэрэнцыі не прагучала. А.Лукашэнка пацьвердзіў палітычныя і культурныя пазыцыі, якія гучалі раней. Сюрпрызам стала толькі заява, што А.Лукашэнку прапаноўвалі купіць 25% акцыяў «Беларуськалію», але ён не пагадзіўся. А загадкай — выказваньне пра пераемніка: «Што да пераемніка, то буду рыхтаваць самага маленькага, унікальны расьце чалавек».

Ад адказу на пытаньне рэдактара «Народнай волі» аб вяртаньні незалежнай прэсы ў распаўсюд А.Лукашэнка фактычна сышоў. Прагучалі супярэчлівыя і доўгія выказваньні, пасьля чаго ён уступіў у доўгі разьняволены дыялёг зь Ёсіфам Сярэдзічам.

Агульны тон размовы быў спакойны, распружаны, у чымсьці нават прымірэнчы — у параўнаньні зь некаторымі ранейшымі выступамі. Так, нібыта А.Лукашэнка стварае сабе новы імідж.

Прапануем пераказ асноўных выказваньняў А.Лукашэнкі.

## Пра палітычную эліту і эканамічную сытуацыю

Я адчуваю сябе камфортна ва ўладзе, можа, я і не зусім адэкватна ўспрымаю працэсы ў краіне, але я ведаю, куды мусіць ісьці краіна, каб разьвівацца. Я больш баяўся за эканоміку, а не за палітычную стабільнасьць, яе ўжо ніхто ня зломіць. Але і ў эканоміцы мы ўсё разьлічылі, бо ведалі, што будзе такі ўдар па энэргапастаўках. Мы ведалі, колькі давядзецца заплаціць за газ, а колькі за нафту... Я таксама перажываю за банкаўскую сыстэму, шмат хто забіраў грошы з банкаў, але абвалу не адбылося. Нас выратавала палітыка накапленьня «залатога» рэзэрву. На валютным рынку сёлета мы маем плюс, цяпер у нас лепшы паказьнік, чым у добрым мінулым годзе. Пра гэта хутка паверацць нават апазыцыйныя СМІ... Наш бюджэт па даходах будзе перавыкананы. Гэта — перамога. Мы цяпер не адчуваем недахопу нафты на нашых нафтаапрацоўчых заводах. Наша эканоміка выстаіць, мы зробім тое, што заплянавалі.

## Пра адносіны з суседзямі

Беларуская эканоміка падштурхоўвае мець добрыя адносіны з Захадам. Там аграмадныя нашы інтарэсы. Аднак мы не пацерпім, калі Эўрасаюз прапаноўвае нам нейкі сьпіс мераў ад беларускіх уладаў, які дыктуе ім апазыцыя. Панукаць намі Эўропе не дазволім...

Захад кажа, што Дзень Волі прайшоў нармальна, але былі не зусім адпаведныя моманты... Дык у іх на Захадзе разганяюць вулічныя акцыі... Іх 400 чалавек у так званай апазыцыі было, так і засталося — гэта баевікі. Усяго апазыцыі паўтары тысячы са спачуваючымі. І мы ім не дазволім гадзіць у цэнтры гораду... Мы гатовыя да дыялёгу, але без усялякіх ультыматумаў. Калі не — то не. У нас ёсьць іншыя партнэры.


PRESIDENT.GOV.BY
Павал Якубовіч і Юры Казіятка падчас прэс-канфэрэнцыі.

## Пра незалежнасьць

Мы ніколі ня будзем рэгіёнам Расеі. Беларусь не прадасьць за цэны на нафту і газ сувэрэнітэт краіны. Год назад Пуцін сказаў, што беларуская бяда ў тым, што Беларусь рэальна незалежная. Наша незалежнасьць вытрымала ўдары і з боку Расеі. Разам з тым нам трэба разумець, што беларуская незалежнасьць будзе дорага каштаваць.

## Пра прэзыдэнцкія амбіцыі ў Расеі

У Расеі няма нарматыўнай базы, каб я стаў там прэзыдэнтам. Тым больш я маю такую самую пасаду ў Беларусі. Я маю тыя ж катэджы і самалёты, што і прэзыдэнт Расеі. Ня трэба думаць, што я імкнуся стаць прэзыдэнтам Расеі.

## Пра саюз Беларусі і Расеі

Без Саюзу з Расеяй нам няможна. Мы не павінныя сыходзіць ад Расеі. Нас піхаюць да гэтага саюзу нашы народы і гісторыя.

## Пра пераемніка

У блізкай будучыні прэзыдэнтам Беларусі будзе Аляксандар Лукашэнка. Я клянуся вам, што ў сям'і мы не размаўляем на гэтую тэму. Калі вы кажаце пра Віктара, то ён сёньня і заўтра будзе слабейшы за мяне. Што да пераемніка, то буду рыхтаваць самага маленькага: унікальны расьце чалавек.

## Пра праблему Чарнобылю

Я ніколі не адмаўляўся ад міжнароднай дапамогі і прапаноўваў апазыцыі разам вырашаць чарнобыльскія праблемы. Але я ня ведаю, што

# у пераемнікі самага маленькага»

яны будуць рабіць пры гэтым. Таптаць асфальт у Менску, ідучы «Чарнобыльскім шляхам»? Альбо яны на нешта яшчэ здольныя? Калі разам, то трэба ехаць у чарнобыльскія рэгіёны з канкрэтнымі справамі і не абавязкова хадзіць сьледам за прэзыдэнтам. Можна частку грошай заходніх адшпіліць, папрасіць Захад накіраваць грошы на чарнобыльскія праблемы, а не на дэмакратыю і свабоду, як яны патрабуюць.

### Пра АЭС

Толькі дурань можа быць супраць пабудовы АЭС. Мы фактычна аб'яўляем тэндэр на будаўніцтва станцыі. Расейцы наўпрост кажуць — аж да разрыву адносінаў, калі вы ня будзеце з намі мець справу. Атамную станцыю мы пабудуем на выгадных для Беларусі ўмовах, у супрацоўніцтве з тымі, хто не выстаўляе нам палітычных умоваў.

### Пра рэгістрацыю СМІ

Лягчэй зарэгістраваць выданьне ня будзе. Калі новае выданьне захоча зарэгістраваць Якубовіч, праблем ня будзе, але ў іншых выпадках мы будзем шмат думаць. Тэлебачаньне і радыё ня будзе прыватызавацца. Распаўсюджваць незалежныя газэты мы ня будзем, але няхай пішуць і самі прадаюць. А каб пускаць кагосьці на радыё, патрэбныя вельмі сур'ёзныя абавязацельствы зь ягонага боку.

### Пра сельскую гаспадарку

Мяне крытыкуюць, што ў Александрыі Лукашэнка стварыў нейкі аграгарадок. Гэта Пракаповіч рабіў, я яго за гэта і крытыкаваў, але ў той жа Александрыі зьявілася рэнтабэльнасьць сельскай гаспадаркі. І там працуюць былыя прапойцы, а могуць жа ня піць, і даяркі там атрымліваюць па 600-800 даляраў...

### Пра эканамічныя выклікі

Мне прапаноўваюць прадаць пакет акцыяў мабільных кампаніяў «Бесту» і Velcom, я думаю над гэтым, бо гэта будзе выгадна дзяржаве, але прадаваць «Беларуськалій» і БМЗ я ня буду. Хоць мне і прапаноўвалі прадаць 25% «Беларуськалію». Вось якраз учора. Прапаноўвалі такія грошы, што страшна назваць, намнога больш, чым «Газпром» прапаноўваў... Мы будзем прыватызоўваць толькі тыя прадпрыемствы, якім не даём рады...

### Пра ўступленьне ва Ўсяусьветную гандлёвую арганізацыю

Калі ўвесь сьвет уступае ў УГА, а мы — не, то я ня бачу ніякай праблемы. Мы ж усё адно будзем працаваць па іхных правілах.

### Пра бясьпеку на дарогах

Я займаюся гэтай праблемай. У нас усе кіроўцамі становяцца за тры месяцы, а калі спадніца карацейшая, то і яшчэ хутчэй. Мы несур'ёзна ставімся да гэтай праблемы.

**Зьміцер Панкавец**

КАМЭНТАРЫ

# Шоў з удзелам Сярэдзіча

Піша **Барыс Тумар.**

Прэс-канфэрэнцыя А.Лукашэнкі мае важную ролю — яна дэманструе грамадзянам, што ў нас ёсьць апазыцыйная прэса, што ў нас ёсьць свабода слова, што ў нас ёсьць падзел уладаў і кампэтэнцый. Напраўдзе ў Беларусі даўно ў сутнасьці няма ні таго, ні другога, ні трэцяга. Затое маем старанна намаляваны фасад. І важную для легітымацыі рэжыму частку гэтага сымулякру стварае так званая незалежная прэса. «Так званая», таму што абмежаваная самацэнзурай, забаронай распаўсюду, недаступная 97% насельніцтва, зьведзеная да мізэрных тыражоў, але нават і гэтага падалося мала — выціснутая ў неправавое поле, пакінутая існаваць у ім на страх і рызыку выдаўцоў і аўтараў, бо ўлады разумеюць, што гэта самы эфэктыўны спосаб кантролю за прэсай і, дазвольце некарэктную мэтафару, русіфікацыі яе мэнтальнасьці — я маю на ўвазе тут ня мову, а ператварэньне паўнапраўнага грамадзяніна ў бяспраўнага, зашуганага халопа.

Няможна вінаваціць прэсу — яна якраз-такі ў гэтых умовах, з апорай на патрыётаў-чытачоў, робіць немагчымае, часам на мяжы геройства.

Прэс-канфэрэнцыі з Лукашэнкам — гэта ўсяго толькі момант, кароткі эпізод безабароннага жыцьця па-за законам. Журналісты пастаўленыя ў псыхалягічныя ўмовы, калі ім бясконца цяжка гаварыць сваім языком, калі няма як нармальна рэагаваць.

Скажам, у чацьвер Лукашэнка абвінаваціў незалежныя газэты, што яны пішуць горш, чым «Маскоўскі камсамолец», бязглудзьдзіцу, парушаюць закон, пісалі, што ў кіраўніка дзяржавы быў запой. Цяжка адказваць на агульныя абвінавачваньні. Але цікава было б спытацца ў аўтара выказваньняў, у якіх канкрэтна газэтах пісалі пра запой? Дык вось, задаваць падобнага кшталту канкрэтныя пытаньні на падобных сустрэчах не ўдаецца.

Пасьля папярэдняга гэткага шоў многія журналісты напісалі, што на прэс-канфэрэнцыі папросту няма сэнсу хадзіць, бо ты ствараеш ілюзію пытаньняў, а напраўдзе ўдзельнічаеш у зрэжысіраваным сэансе прамываньня мазгоў.

Вы так кажаце, бо вас ня клічуць, — падумаў сабе хтосьці з запрошаных. А мы ганарымся, што нас ня клічуць, у нашай сытуацыі гэта высокая ацэнка, — пярэчылі крытыкі.

Так ці інакш, рэдактары абраных СМІ зноў вырашылі: варта.

Думаю, мэтр беларускай прэсы Ёсіф Сярэдзіч ведае, што робіць, і мае

**Працяг на старонцы 6.**

# Фатальная боязь эфэкту даміно

Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Але ў невялікай і ня надта багатай на рэсурсы краіне цяжка выбудаваць ідэальную дыктатуру. Як ні выкарчоўвай альтэрнатыву. Бо ў каардынатах сусьветнага рынку Беларусь — гэта малая адкрытая эканоміка.

Таму і прагучала: нашу палітычную стабільнасьць «ужо ніхто ня зломіць», а вось эканоміка, маўляў, раз-пораз падкідвае падставы для трывогі.

Выглядае на тое, што першы шок ад несяброўскіх коштаў на газ і нафту сапраўды прайшоў (толькі крыўда не згасае). Але ж эканоміка — рэч дастаткова інэрцыйная, нэгатыўныя трэнды вылузваюцца не адразу. Так што болей сур'ёзныя наступствы «ўдару з усходу» могуць вылезьці бокам праз нейкі час. Градыент падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты не абяцае спакойнага жыцьця.

Пакуль што ў рэзэрве — кропкавы продаж «фамільнага срэбра». Улада не пляну сыстэмных рынкавых рэформаў. Лукашэнка прызнаўся: атачэньне раіла яму пайсьці на такія крокі пад маркай падаражэньня энэрганосьбітаў. Але засьцярога абрынуць сыстэму, гэтая пэрманэнтная боязь эфэкту даміно, аказалася мацнейшай, чым спакуса запусьціць мэханізмы рынкавай трансфармацыі.

Мне падалося паказальным прызнаньне, што ў крытычныя моманты эканоміку даводзілася адпускаць ў вольны дрэйф, каб не нашкодзіць. То бок ёсьць адчуваньне, што дырыжызм ня лепшы мэтад, але ж, пакуль умовы дазваляюць, лепей трымаць усё ў кулаку.

Раман з Захадам ня вытанчыўся. «Мы гатовыя да дыялёгу, але без усялякіх ультыматумаў. Калі не — то не. У нас ёсьць іншыя партнэры». Пад ультыматумамі маецца на ўвазе ўсё тое, што тычыцца дэмакратызацыі. Іншыя партнэры — Вэнэсуэла, Іран, Эміраты, карацей, «вялікая дуга» тых дзяржаў, лідэры якіх не «зацыкленыя» на правах чалавека. Што ж да Захаду, дык тут розьлік на ягоны прагматызм. Напрыклад, замова на праект АЭС — гэта мільярды эўра. Выбірайце: або эфэмэрныя прынцыпы, або жывыя грошы!

Карацей, лібэралы могуць расслабіцца. Сьвята на іхняй вуліцы ў агляднай пэрспэктыве не прадбачыцца. Выказваньні афіцыйнага кіраўніка ў пытаньнях дачыненьняў з апазыцыяй і незалежнай прэсай спадзеваў на адлігу не даюць.

Апазыцыі апрыёры адмаўляецца ў канструктыўнасьці. Таму любыя заклікі тытульнай апазыцыі да супрацы выглядаюць марным лямантам у пустэльні. А любыя мадыфікацыі ейнай стратэгіі (ад рэвалюцыі — да эвалюцыі і г.д.) будуць заставацца экзэрсісамі для ўнутранага трэнінгу, пакуль яна, апазыцыя, ня стане ўяўляць з сябе грознай сілы, зь якой мусіш лічыцца воленс-ноленс.

Да прэсы непрыхаванае патрабаваньне — ляяльнасьць. Зноў жа тут бачацца праблемы мэнтальнага ўзроўню. Лёгіка цяперашняй улады жорстка вызначаецца яе звышзадачай — самазахаваньне любым коштам. Беларускае кіраўніцтва выказвае шчырае неўразуменьне што да дзівацкіх ўмоваў Эўразьвязу: ну як можна, напрыклад, прыграваць на грудзях зьмяю ў выглядзе непадкантрольнай прэсы?

Але падмурак сыстэмы, якім бы трывалым ён ні здаваўся, — гэта толькі выспа ў віраваньні усясьветнага рынку, глябальнае палітыкі ды інфармацыйных плыняў. Паступовая эрозія пад уплывам вонкавых чыньнікаў падаецца на сёньня самым імаверным сюжэтам. На нейкім этапе гэта можа сапраўды прывесьці да эфэкту даміно.

# Шоў з удзелам Сярэдзіча

**Працяг са старонкі 5.**

рацыю, калі прымае такія выклікі, нават калі цябе запрашаюць на піяр-акцыю дыктатуры.

Ёсьць сэнс ва ўсім тым, што робіць наша жыцьцё нармальнейшым — больш адпаведным нашым чаканьням ад яго. Ёсьць сэнс у тым, каб прэс-канфэрэнцыі былі. Ёсьць сэнс у тым, каб у іх бралі ўдзел усе ахвотныя. Ёсьць сэнс у тым, каб пытаньні задаваліся і на іх гучалі адказы. З учарашняга шоў разумны слухач шмат чаго пачэрпнуў.

Што БелаПАН «ня вельмі кепскае агенцтва».

Радыё — гэта «вельмі моцныя абавязацельствы».

Закон мае адно дзеяньне для Якубовіча, і другое — для Ліпая.

Усе роўныя, але ёсьць раўнейшыя.

Кіраўнік дзяржавы жыве ў сьвеце, створаным такі намі, незалежнымі СМІ, хоць для грамадзянаў старанна малюецца іншая карціна сьвету.

Усё рацыянальнае варта. Прыкрасьць выклікаюць тыя моманты ў нашых паводзінах, якія не набліжаюць беларускую рэчаіснасьць да нармальнасьці. Каб ня шкодзіць самому сабе, каб не складаць у спажыўцоў нашай інфармацыйнай прадукцыі памылковых уражаньняў, трэба кожнаму з нас дзейнічаць у адпаведнасьці з законамі жанру, у гэтым выпадку, прэс-канфэрэнцыі.

Журналіст не павінен на прэс-канфэрэнцыі нечага прасіць. Прэс-канфэрэнцыі існуюць не для таго. Яны існуюць, каб задаваць пытаньні. Які пусты ў сэнсе атрыманага матэрыялу, але пры гэтым прынізьлівы для прафэсійнага гонару і рэпутацыі вынік мелі тры пытаньні-просьбы недзяржаўных рэдактараў. І які бліскучы журналісцкі матэрыял сп.Сярэдзіч атрымаў з адзінага пытаньня-пытаньня: аб пераемніку.

Чаму так? Яшчэ й таму, што постсавецкія палітыкі лепш за прафэсійныя кодэксы і, на жаль, нават лепш за Канстытуцыю, дагэтуль разумеюць іншы кодэкс, які зводзіцца да квінтэсэнцыі: ня вер, ня бойся, не прасі. Гэта, дарэчы, і самая адэкватная стратэгія выжываньня ў стане бяспраўнасьці і безабароннасьці.

# Ракава й Чубрык: Перамены непазьбежныя

Эканамісты **Алена Ракава** і **Аляксандар Чубрык** прааналізавалі уплыў росту цэнаў на энэргарэсурсы на беларускую эканоміку. Вынікі сваіх дасьледаваньняў яны апублікавалі на сайце «Наша думка».

Яны адзначаюць, што сёлетні скачок цэнаў — гэта яшчэ не мяжа, у бліжэйшыя гады сытуацыя будзе толькі пагаршацца: у 2011 г. беларусы пачнуць атрымліваць газ па эўрапейскіх коштах, а мыта на нафту для нашай краіны ўзрасьце праз два гады да 35,6% ад памеру дзеючага ў Расеі мыта.

На думку А. Ракавай і А. Чубрыка, гэтыя зьмены нэгатыўна адаб'юцца на дынаміцы эканамічнага разьвіцьця і запатрабуюць карэкціроўкі эканамічнай палітыкі.

Рост эканомікі цягам апошніх гадоў у найбольшай ступені абавязаны танным энэрганосьбітам і магчымасьці рээкспартаваць нафтапрадукты. Кошт тысячы кубамэтраў расейскага газу для Украіны быў удвая вышэйшым, чым для Беларусі.

Доля нафтапрадуктаў у экспарце летась складала каля 40% (у 2002 г. толькі 18%), што прынесла краіне прыбытак каля $3 млрд. Гэта дазволіла ўраду падвышаць заробкі і не рэфармаваць эканоміку. У выніку такога субсыдыяваньня «незаўважанымі» заставаліся залежнасьць беларускага экспарту ад каньюнктуры на зьнешніх рынках, а таксама зьніжэньне канкурэнтаздольнасьці айчынных тавараў.

Вынікі перамоваў па энэрганосьбітах аказаліся кампраміснымі, што зрабіла наступствы падаражаньня менш балючымі. Аднак адчуюцца яны ўжо ў бягучым годзе. Выдаткі бюджэту павялічацца за кошт дадатковага субсідыяваньня сельскай гаспадаркі, ЖКГ і энэргетыкі, а таксама за кошт павелічэньня аб'ёму ільготаў.

Для вырашэньня праблемы падтрыманьня стабільнага валютнага курсу Нацбанк і Міністэрства фінансаў праводзяць актыўную працу па прыцягненьні рэсурсаў на зьнешніх рынках. Вядуцца перамовы аб магчымасьці атрыманьня ў Расеі стабілізацыйнага крэдыту ў памеры 1,5 млрд. даляраў ЗША. Вялася таксама гаворка пра прыцягненьне вялікіх крэдытаў зь Кітаю, а таксама з дапамогаю Raiffeisen Bank. Атрыманьне адмысловага крэдытнага рэйтынгу дазволіла б Беларусі разьлічваць на грашовыя займы.

Захады па зьніжэньні энэргаёмістасьці эканомікі могуць даць эфэкт у сярэднетэрміновай пэрспэктыве. Аднак сёньня расейскі пакупнік, чый дабрабыт паступова ўзрастае, пачынае губляць цікавасьць да беларускіх тавараў. І гэта, разам з вытворчасьцю уласна расейскіх замяняльнікаў беларускіх тавараў, стварае асноўны выклік для беларускіх вытворцаў. Непрымальная залежнасьць ад расейскага рынку, што сталася прычынаю палітычнага шантажу з боку Расеі, робіць неабходным выхад беларускай прадукцыі на альтэрнатыўныя рынкі.

Новая сытуацыя, што склалася на пачатку году, можа прывесьці да непасьлядоўных крокаў у бок лібэралізацыі эканомікі праз прыцягненьне замежных інвэстыцыяў і частковай прыватызацыі дзяржмаёмасьці.

Іншага спосабу кампэнсаваць дэфіцыт эканамісты не прадбачаць. Толькі сёлетняе павышэньне цэнаў нафты выкліча дадатковыя выдаткі бюджэту ня меншыя за 0,8 млрд даляраў, а газу — на 0,4 млрд.

**Сямён Печанко**

## Беларускую нафтаперапрацоўку чакаюць новыя праблемы

У найбліжэйшай і сярэднетэрміновай пэрспэктыве беларускую нафтаперапрацоўку чакаюць новыя складанасьці, лічыць генеральны дырэктар дасьледчай групы «Петрамаркет» (Расія) Якаў Рудэрман. Паводле ацэнак Я.Рудэрмана, сытуацыя можа ўскладніцца ўжо пасьля 1 чэрвеня, калі экспартная мыта на нафту дасягне ў Расіі 200 даляраў за тону. Апрача таго, недагрузка беларускіх НПЗ можа ўзьнікнуць пасьля будаўніцтва Расіяй новых трубаправодаў: «Унеча—Прыморск» у абыход Беларусі, а таксама нафтаправоду «Усходняя Сібір — Ціхі акіян».

**Паводле БелаПАН**

## Асваеньне радовішчаў нафты — аснова замежнай палітыкі Беларусі

Пра гэта заявіў 12 красавіка в.а. старшыні канцэрну «Белнафтахім» Міхаіл Асіпенка на практычнай канфэрэнцыі «Беларуская нафтавая галіна ўчора, сёньня, заўтра. Экспарт нафтапрадуктаў з Рэспублікі Беларусь. Беларуская нафтаперапрацоўка». У пэрспэктыве, мяркуе ён, пастаўшчыкамі нафты для Беларусі будуць ня толькі Расія, але і Азэрбайджан, Вэнэсуэла.

**Паводле БЕЛТА**

## Попыт на валюту зноў дасягнуў рэкорднага ўзроўню

На мінулым тыдні попыт на даляры ЗША на Беларускай валютна-фондавай біржы, роўны $97,3 млн, зноў перавысіў прапанову, якая склала $86,4 млн. Таксама на мінулым тыдні, паводле зьвестак БВФБ, попыт на эўра дасягнуў рэкорднага ўзроўню — €117,661 млн, аднак Нацыянальны банк не задаволіў яго спаўна, таму аб'ём таргоў па эўра застаўся на звычайным узроўні і склаў €18 млн.

**МБ**

## Афіцыйная статыстыка: крызіс збыту ў харчовай прамысловасьці

Валавы ўнутраны прадукт у Беларусі ў студзені-сакавіку 2007 года ўзрос на 8,4% да ўзроўню студзеня-сакавіка 2006. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Аб'ём прамысловай вытворчасьці вырас на 5,9%. Выпуск спажывецкіх тавараў — на 2,9%. Пры гэтым вытворчасьць прадуктаў зьнізілася на 5,1% (прагноз росту на год — 9-10%).

Узровень рэнтабельнасьці за два першыя месяцы году склаў 11,8% пры прагнозе на год 14,5%.

**МБ**

# Брыгаднікі

...І вось ужо інтэлектуальная супольнасьць гатовая чытаць гнюсныя чуткі, зь якога б сьметніка тыя чуткі ні паходзілі. І вось ужо на палітычным сайце друкуецца ананімка. І вось ужо легенда беларускага Адраджэньня называе іншага палітыка «мразьзю». Пра белнэт піша **Віталь Тарас**.

### «Вам не западло?»

Цэнтар прававой абароны пры ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» падрыхтаваў свае заўвагі да праекту закону «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі». (Закон яўна пісалі не журналісты.)

Сярод іншых навацыяў, распрацаваных дэпутатамі палаты прадстаўнікоў, юрысты БАЖ зьвяртаюць увагу на артыкул 39 праекту закону, дзе гаворыцца, што «можа быць прадугледжана абавязковая ідэнтыфікацыя асобаў, якія прымаюць удзел у інфармацыйным абмене, з выкарыстаньнем інфармацыйных сетак». Паводле юрыстаў, ёсьць небясьпека, што пад «абаронай інфармацыі» маецца на ўвазе вызначэньне кожнага карыстальніка інфармацыйнымі рэсурсамі, у тым ліку, магчыма, і інтэрнэтам.

У гэтай сувязі ўспамінаецца анэкдот пяцігадовай даўніны. Ідзе прэсавая канфэрэнцыя прэзыдэнта Расеі. Празь інтэрнэт паступае ананімнае пытаньне: «Вам не западло, Уладзімір Уладзіміравіч, прымаць пытаньні ад ананімаў?» Адказ: «Не, уладальнік IP-адрасу 212.98.173.150, SML, правайдэр «Мэдыякамсат», Санкт-Пецярбург, вуліца Малая Фантанка, 10, кватэра 29, Сідараў Васіль Пятровіч, не западло».

Сёньня ўжо ня сьмешна. Спэцслужбы Расеі падрыхтавалі праект закону, амаль аналягічны таму, што разглядаецца цяпер у Беларусі. Мэта? Ну, зразумела ж, барацьба з тэрарызмам. У інтарэсах законапаслухмяных мірных грамадзянаў.

Расейскі інтэрнэт — «рунэт» — пачаў разьвівацца раней за белнэт і сёньня налічвае дзясяткі мільёнаў карыстальнікаў. Зона рунэту лічыцца апошняй зонай у пуцінскай Расеі, вольнай ад дзяржаўнай цэнзуры. Вызначыць кожнага зь іх, зразумела, — шмат клопату для спэцслужбаў. Таму яны досыць даўно і пасьпяхова выкарыстоўваюць іншыя мэтады ў барацьбе з іншадумствам у сеціве. У расейскім нтэрнэце нарадзіўся нават асобы тэрмін — брыгадніцтва.

Акурат чатыры гады таму на сайце www.vestnik.com (а пасьля на іншых) зьявілася цэлае дасьледаваньне, прысьвечанае гэтай зьяве, пад назвай «Віртуальнае вока старэйшага брата». Яго аўтары — журналістка, былая карэспандэнтка Бі-Бі-Сі Ганна Палянская, гісторык, супрацоўнік вядомага часопісу «Гласность» Андрэй Крываў і праграміст-аналітык Іван Ламко. Усе яны цяпер жывуць за межамі Расеі. Няма магчымасьці дый патрэбы цытаваць згаданую работу падрабязна. Але некаторыя характарыстыкі аўтараў датычна брыгаднікаў прывесьці варта:

«Ахоўна-агрэсіўная, таталітарная ідэалёгія, якую прапагандуюць гэтыя людзі, тут зусім не галоўная прыкмета. Некаторыя сябры гэтай групы стараюцца выглядаць нават адносна лібэральна. Але, акрамя звычайнай «дзяржаўніцкай» ідэялёгіі (а таксама ксэнафобіі, антыамэрыканізму, антысэмітызму і нецярпімасьці да іншадумства), гэтыя людзі вылучаюцца жорсткай установкай, групавой карпарацыйнай маральлю, агульнай інфармацыйнай базай, дакладнымі нормамі паводзінаў, спэцыфічнымі мэтадамі палемікі і «работы з аб’ектам». У гэтай групы існуюць агульныя для ўсіх форумаў прынцыпы апрацоўкі масавае сьвядомасьці, зьвязаныя перш за ўсё з мэтанакіраванай маной, паклёпам і дэзынфармацыяй.

…У якасьці доказаў сваіх лёзунгаў і тэорыяў яны прыводзяць адвольныя трактоўкі фактаў і падзеяў, часта абсалютна ілжывыя, прымушаючы сваіх праціўнікаў шукаць спасылкі-зьняпраўджаньні... Мэтад зручны і эфэктыўны, ён адцягвае ўвагу апанэнтаў ад вострых і непрыемных для ўлады дыскусіяў. Улюбёны прыём палемікі сяброў «брыгады» — цытаваньне афіцыйнай і паўафіцыйнай прапаганды, кшталту артыкулаў з ўэб-выданьня «Страна.ру».

Акрамя таго, на думку аўтараў дасьледаваньня, брыгаднікаў выдае нізкі культурны ўзровень і характэрная мова: «Пераважная большасьць брыгаднікаў кепска валодае роднай мовай, дапускаючы вялікую колькасьць тыповых стылістычных, лексічных і граматычных памылак, праз якія ім цяжка хавацца за рознымі псэўданімамі-нікамі… У «брыгаднікаў» яўныя праблемы з пачуцьцём гумару, жарты іх заўсёды маюць клязэтна-казармавае адценьне і маюць дачыненьне да гомасэксуалізму, прастытуцыі, парнаграфіі і г.д.»

Паводле аўтараў, тыповы ведамасны жарт «канчайце шукаць ГБ пад ложкам!», яны сустракалі ў розных форумах некалькі дзясяткаў разоў.

Сярод іншых асаблівасьцяў, брыгаднікі вызначаюцца частай зьменай псэўданімаў (нікнэймаў), інфармацыйным шумам (флудам) і падробкай нікаў. Блатныя прыёмы, правакацыі, лаянка — усё гэта таксама норма жыцьця ўэб-брыгадаў, канстатуюць аўтары дасьледаваньня.

### Шукаць ГБ пад ложкам

Можна па-рознаму ставіцца да прыведзеных высноваў. Можна лічыць гэта формай параноі ці проста ненавуковымі выдумкамі. У расейскім ЖЖ, прынамсі, пераважна так аб іх і адгукаюцца. Аднак варта пачытаць некаторыя форумы на палітычныя тэмы ў белнэце — на тут.бай, напрыклад, каб пераканацца, што згаданыя вышэй пэрсанажы існуюць у сапраўднасьці. Дарэчы, яны гэтаксама кепска (ці яшчэ горш) валодаюць беларускай мовай, асабліва клясычным правапісам. Дый узровень іхнай абазнанасьці ў гісторыі Беларусі часьцей за ўсё выдае іх з галавой.

Аднак гаворка цяпер не пра брыгаднікаў. Дакладней, ня толькі пра іх. Белнэт, асабліва беларускамоўны, разьвіваецца шпаркімі тэмпамі. Калі так пойдзе далей, ніякіх брыгаднікаў на тое, каб стрымаць разьвіцьцё ў

гэтым кірунку, ня хопіць. А гэта ня можа не трывожыць уладу, паколькі само існаваньне цэлага сэктару «іншадумства» ды «іншамоўства» у грамадзтве ўяўляецца ім патэнцыйнай пагрозай, суцэльнай правакацыяй.

І самае галоўнае — як жа працягваць работу па «разлажэньні» апазыцыі і нацыянальна сьвядомай інтэлігенцыі, не выкарыстоўваючы перавагі інтэрнэту? (Словы «разлажэньне праціўніка» было прыдуманае бальшавіцкімі агітатарамі і ўзятае на ўзбраеньне ЧК-ГПУ-НКВД-КГБ. І сапраўды, лепшага слова не прыдумаеш.)

Прыдумляюцца ўсё новыя, усё больш маштабныя формы й мэтады правакацыяў, у якіх задзейнічаныя ўжо ня проста асобныя журналісты ці карыстальнікі, але цэлыя інтэрнэт-сайты і адпаведна — інтэрнэт-супольнасьці.

Сайт «Трэці шлях» да апошняга часу нічым звышасаблівым сярод іншых беларускіх сайтаў не вылучаўся. Хіба што запомніліся перадрукі з сайту «Новая Эўропа» публікацыяў філёзафа Адамянца, у якіх той абараняў Беларусь ад беларускай мовы.

І вось «Трэці шлях» днямі зрабіў сэнсацыйнае выкрыцьцё. З дапамогай расейскага палітоляга Андрэя Суздальцава стваральнікам сайту ўдалося знайсьці аўтара фальшыўкі – падмётнага электроннага ліста ад імя «патрыётаў Беларусі, супрацоўнікаў Камітэту дзяржаўнай бясьпекі». Падобныя лісты пэрыядычна рассылаліся ў СМІ і раней. Трэба адзначыць, што сайты, якія пазыцыянуюць сябе менавіта як СМІ, а ня як штабы пэўных палітычных партыяў альбо піяр-праекты, ніколі гэтыя правакацыйныя лісты не публікавалі.

Гэтым разам ліст «патрыётаў» быў надрукаваны толькі на сайце www.kozylin.com. Домэнам, гостынгам і праграмным забесьпячэньнем гэтага сайту, як высьветлілася, валодае іншы інтэрнэт-рэсурс — згаданы вышэй «Трэці шлях» (3dway.org). Яго тэхнічная група (!) «прыйшла да высновы, што сайт захоплены прахадзімцамі і вырабнікамі фальшывак», і адлучыла казулінскі сайт ад інтэрнэту. Яшчэ адзін сайт — afn.by — адразу перадрукаваў гэтую дзіўную інфармацыю. Пры гэтым, спаслаўшыся на ўжо згаданага вышэй спадара Суздальцава, сайт паведаміў, што на аўтара фальшывак — «былога юрыста» Алега Волчака — загадзя былі пастаўленыя нейкія «электронныя пасткі», і яго, маўляў, злавілі за руку. Праўда, ні Суздальцаў, ні хто-небудзь яшчэ доказаў ягонай віны не прывёў.

Ірына Казуліна выступіла з публічным зьняпраўджаньнем высноваў, быццам «казулінскім» сайтам кіруе Алег Волчак, і ўзяла на сябе адказнасьць за публікацыю ананімнага ліста. Пры гэтым яна прызнала гэты факт «не зусім этычным».

Здавалася б, на гэтым у гісторыі трэба было б ставіць кропку. Памыўшы пасьля гэтага рукі з мылам.

## Мразь на палачцы

Андрэй Суздальцаў, як вынікае зь яго камэнтаў на «афн», не гатовы дараваць Казулінай. І кропку ставіць ня хоча.

Крыўду спадара Суздальцава зразумець можна. Прынамсі, на ўлады РБ. У выніку публікацыяў у «СБ» расейскі палітоляг быў абвінавачаны ў аўтарстве лістоў «патрыётаў». Яго фактычна выкінулі зь Беларусі, забараніўшы прыяжджаць сюды да жонкі і сваякоў. Для шырокай грамадзкасьці гэты факт застаўся амаль незаўважаным. Ніхто з палітычных дзеячоў і былых аднадумцаў ці калегаў Суздальцава ў Беларусі з гучнымі пратэстамі з гэтай нагоды не выступаў. Гэта праўда.

Але наколькі інтэлігентна, ці скажам прасьцей — па-мужчынску, зь яго боку ўскладаць віну за свае жыцьцёвыя праблемы на жанчыну, муж якой асуджаны на пяць з паловай гадоў турмы і сям'і якой даводзіцца цяпер цярпець ніяк ня меней, чым Суздальцаву? На гэтае пытаньне хай ён адкажа сам для сябе.

Магчыма, словы «інтэлігенцыя», «інтэлігент» у Расеі ўжо выйшлі з моды. У адной зь перадач расейскай службы радыё «Свабода» нядаўна абмяркоўвалі гэтую тэму. Казалі аб тым, што панятак «інтэлігенцыя» становіцца ці ўжо стаўся анахранізмам. Інтэлігенты даўно перасталі быць «уладарамі думак». Самі яны — тыя, хто застаўся, — аб гэтым ня надта шкадуюць. Трэба прыстасоўвацца да патрэбаў і правілаў новай эпохі. Трэба наноў вучыцца прагінацца перад уладай і сапраўднымі ўладарамі жыцьця.

Тое ж тычыцца і сёньняшняй Беларусі.

Тып старога інтэлігента, ахвярнага настаўніка, бяссрэбніка ў сучасным грамадзтве запатрабаваным не назавеш. Вось толькі на месцы старой маралі ды маральнасьці нічога новага ўзамен яе ня ўзьнікла. І наўрад ці ўзьнікне.

Вяртаючыся да тэмы «брыгаднікаў», трэба заўважыць, што калі нават удаецца іх распазнаць у інэце, іхная дзейнасьць не становіцца ад гэтага меней шкоднай. Справа ня ў тым, што ім удаецца навязаць свой пункт гледжаньня іншым, абараніць вышэйшую ўладу, паказаць пралікі апазыцыі. Гэтага якраз не ўдаецца. Але сам стыль — хамскі, нястрымана-агрэсіўны, правакацыйны — становіцца звыклым і прымальным. У тым ліку, у інтэрнэце.

Не пачуць свайго апанэнта, не паспрабаваць зразумець, што ён кажа, але пастарацца прынізіць яго, зрабіць так, каб «мала не падалося». У самых разумных галовах пасяляецца бальшавіцкая разруха. Зайздрасьць, непрымірымасьць і нянавісьць, як інфэкцыйныя хваробы, перадаюцца вэрбальным шляхам. Горш гэтага можа быць толькі любоў да сябе — адзінага і непаўторнага носьбіта ісьціны.

І вось ужо інтэлектуальная супольнасьць гатовая паверыць любым, самым гнюсным чуткам пра любога дзеяча апазыцыі, зь якой бы крыніцы, зь якога б сьметніка тыя чуткі ні паходзілі. І вось ужо на палітычным сайце друкуецца ананімка, а ўсе астатнія сайты, якія, нібыта, адвярнуліся ад яе, разьдзімаюць вакол публікацыі чорны піяр, атмасфэру скандалу і сада-мазахісцкай гістэрыі.

І вось ужо вядомы палітэмігрант, легенда беларускага Адраджэньня называе іншага беларускага палітыка «мразьзю». Відавочна, стваральнікі домэна з красамоўнай назвай «prauda» лічаць гэты выраз эталёнам маральнасьці. Кажучы словамі расейскага клясыка, «гэтая рэч мацнейшая за «Фаўста»! Гэта мацней за словы «мочить в сортире» і нават за «шалупонь» у вуснах першых дзяржаўных асобаў.

Таму што слова «мразь» становіцца характарыстыкай для нас усіх. Мы ўжо амаль зьмірыліся з тым, што мы — гэта яны. Мы ўжо самі — амаль што «брыгаднікі».

# Расея як Беларусь

Гары Каспараў спадзяецца, што настаў хісткі момант: Пуцін баіцца прызначыць моцнага пераемніка, каб ня страціць асабістых гарантыяў, а таксама баіцца прызначыць слабога пераемніка, каб не пахіснуўся рэжым. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Расея імкліва ператвараецца ў Беларусь. Улады жорстка разагналі апазыцыйныя акцыі, якія прайшлі ў выходныя ў расейскіх гарадах. Удзельнікаў «Маршаў нязгодных», якія ладзіла грамадзянская кааліцыя «Іншая Расея» ў суботу ў Маскве, а ў нядзелю ў Санкт-Пецярбургу, было ў разы менш, чым нагнаных міліцыянтаў. Перад выходнымі ў расейскую сталіцу, бы тыя дружыны на Кулікоўскую бітву, сьцягваліся падмацаваньні з рэгіёнаў — каля 2 тысячаў АМОНаўцаў з Удмуртыі, Мардовіі, Чувашыі, Пензенскай і Ніжагародзкай вобласьцяў. Агулам колькасьць міліцыі ў расейскай сталіцы дасягнула 9 тыс. чалавек.



**Гары Каспараў.**

Дакладна ацаніць колькасьць дэманстрантаў цяжка, бо ім так і не далі сабрацца разам, падзяляючы на групы і арыштоўваючы. Да месца правядзеньня маскоўскага мітынгу «Іншай Расеі» дабраліся толькі каля 1500 чалавек. Затрыманьні былі масавыя: у Маскве — больш за 200 чалавек, у Санкт-Пецярбургу — каля 100. Быў арыштаваны нават лідэр «Іншай Расеі» Гары Каспараў. Былога расейскага прэм'ера Міхаіла Касьянава, які цяпер узначальвае апазыцыйны Народна-дэмакратычны саюз, ад спэцназаўцаў адбіла асабістая ахова.

## Падабенствы

Амаль немагчыма адрозьніць фота разгону «Маршаў нязгодных» ад здымкаў, зробленых у часе «зачыстак» на беларускіх апазыцыйных мітынгах. Тая ж плямістая форма ды чорныя шлемы ў АМОНаўцаў, тыя ж заломленыя рукі мітынгоўцаў. Толькі прыгледзеўшыся, заўважаеш трыкалёрчыкі на спэцназаўскіх шаўронах.

Але падабенствы пачаліся ўжо тады, калі думскі сьпікер Грызлоў загадзя наганяў пострах: маўляў, людзі, якія выходзяць на вуліцы, «могуць нават ня ведаць, што іх фактычна ўцягваюць у правакацыю, зьвязаную з гвалтам і магчымымі ахвярамі». Яшчэ крыху — і ў ход, бадай, пайшлі б дохлыя пацукі.

Знаёмая карціна: Гары Каспарава арыштоўваюць, сьпешна судзяць ды штрафуюць за выгукваньне антыўрадавых лёзунгаў. Хіба што не за мацюкі. Судовы працэс — звыклы фарс, праз які прайшлі ўжо сотні беларусаў.

Асноўныя расейскія мэдыі ў асьвятленьні «Маршу нязгодных» скаціліся да ўзроўню беларускіх каналаў.

АМОН выканаў сваю працу на «выдатна», адрапартаваў ГУУС Масквы. Паводле дадзеных міліцыі, у шэсьці ўдзельнічала толькі 500 чалавек. «Нармальна, усё нармальна», — узгадваецца стары гіт Лявона Вольскага.

Пра што думае маўклівая большасьць у Расеі ды ў Беларусі, застаецца толькі здагадвацца.

## Адрозьненьні

Калі ўгледзецца ў фота беларускіх і расейскіх мітынгоўцаў, заўважаеш малапрыкметнае, але істотнае адрозьненьне. На тварах маса эмоцыяў — вера, абурэньне, сполах, але калі ў вачах расейцаў чытаецца зьдзіўленьне, то ў вачах беларусаў не заўважаеш ілюзіяў. Тое самае адчуваеш, чытаючы ў інтэрнэце камэнтары ўдзельнікаў маршу. Расейскія апазыцыянэры — гэта мы 10 гадоў таму. Яны яшчэ толькі пачынаюць разумець, што ў іхнай краіне ня дзейнічае закон і што іхныя правы — пусты гук для ўлады. Яны з гэтага яшчэ *зьдзіўляюцца.*

Падзеі ў Расеі кідаюцца ў вочы сваёй нечаканай, непрапарцыйнай маштабу пратэстаў жорсткасьцю. Замежнаму рэпартэру ледзь не праламалі чэрап, пэнсіянэраў зьбівалі на горкі яблык дручкамі ды ботамі, «яблычніцы» Вользе Цапілавай зламалі нос. Беларускія «праваахоўнікі» выходзілі на такі «ўзровень» неяк больш паступова — былі часы, калі ў Менску ад дручкоў ратаваў звычайны журналісцкі бэджык. А ў Маскве зьбівалі рэпартэраў, нягледзячы на тое, што яны апранутыя былі ў адмысловыя камізэлькі.

І ў Беларусі, і ў Расеі актыўная апазыцыя застаецца ў меншасьці, але адчуваецца якасная розьніца ў суадносінах. У 10-мільённай Маскве на маніфэстацыю «нязгодных» выйшла меней людзей, чым звычайна зьбіраецца на пратэсты ў 2-мільённай беларускай сталіцы.

Расейская спэцыфіка выявілася і ў тым, што ўлада актыўна ладзіла «альтэрнатыўныя» акцыі накшталт «Маршу згоды» прапуцінскай моладзевай арганізацыі «Маладая гвардыя». У Беларусі рэжым толькі-толькі пачынае выкарыстоўваць такую тактыку.

А яшчэ пратэсты сьцьвердзілі, што ў Расеі існуе не адна, а дзьве апазыцыі.

## Дзьве апазыцыі

Зрэшты, будзе лепей сказаць, што ў Расеі існуюць апазыцыя і псэўдаапазыцыя. Гэтак, паралельна з «Маршам нязгодных» у Маскве прайшло яшчэ пяць мітынгаў «апазыцыйных» сілаў. Міліцыя ня ўмешвалася.

Як адрозьніць псэўдаапазыцыю ад апазыцыі? Натуральны індыкатар — каго разганяюць, а каго — не. Але прынцыповае адрозьненьне палягае ў ідэях і спосабах дамагацца іх зьдзяйсьненьня.

Людзі, якія прыйшлі на «Марш няз-





Мільённай Маскве на маніфэстацыю «нязгодных» выйшла ў разы меней людзей, чым зьбіраецца на пратэсты ў 2–мільённай беларускай сталіцы.

годных», у сваёй большасьці патрабавалі права голасу. Яны лічаць, што ўлада павінна падпарадкоўвацца грамадзяніну, а не наадварот. Для камуністаў-зюганаўцаў гэтая ідэя — чыстая абстракцыя, яны больш ахвотна мараць пра справядлівы сацыяльны лад, які, натуральна, будзе збудаваны пад іх разумным партыйным кіраўніцтвам. Карыкатурныя ксэнафобы з «Руху супраць нелегальнай іміграцыі», якія таксама мітынгавалі 14-га, знаходзяцца ў апазыцыі не да сыстэмы, а да «іншародцаў». Лібэральны Саюз правых сілаў дэкляруе дэмакратычныя ідэі, аднак, абараняючы іх, ня дужа сьпяшаецца лезьці ў самое пекла. У выніку камуністы адмаўляюцца ад супрацоўніцтва зь «Іншай Расеяй», Саюз правых сілаў падпісвае навязаную Крамлём «Хартыю супраць экстрэмізму», нефармальнае абавязальніцтва пазьбягаць рэзкай крытыкі Пуціна ды ўдзелу ў вулічных акцыях «радыкалаў», а «Яблык» афіцыйна ня ўдзельнічае ў «Маршы нязгодных». За ўсім гэтым праглядаецца нежаданьне кіраўніцтва «апазыцыйных» партыяў страціць апошнюю магчымасьць трапіць у лялечную Думу — то бок захаваць такі-сякі палітычны ўплыў, які ў Расеі мае канкрэтны грашовы эквівалент.

Дый сама кааліцыя «Іншая Расея» стракатая. Экс-прэм’ер Міхаіл Касьянаў зьвязаны з апальным ельцынскім кланам, а непатапляльная Ірына Хакамада не выклікае асаблівага даверу сваёй схільнасьцю да мэдыягульняў. Безумоўная знаходка руху — Гары Каспараў. Ён выклікае давер ня толькі таму, што яму ўжо ня трэба марыць пра грошы ды сусьветную вядомасьць. Гары



**Дэманстрацыя прапуцінскай «Маладой гвардыі».**

Каспараў — бадай, адзіны зь лідэраў антыпуцінскай апазыцыі, хто прыйшоў у палітыку сам, звонку, а ня быў высіснуты туды рэжымам.

## Высновы

Антыпуцінская апазыцыя выглядае пярэста. З аднаго боку — клясычныя дысыдэнты, лібэральныя інтэлектуалы, зь іншага — нацыянал-бальшавікі з воклічамі «Сталін! Бэрыя! ГУЛАГ!». На першы погляд, тут праяўляецца слабасьць апазыцыі: маўляў, нашкрэблі ў саюзьнікі каго змаглі. Але, калі зірнуць зь іншага боку: што яднае гэтыя сілы? Нічога, акрамя жаданьня зрабіць так, каб усе ў краіне, уключна з уладай, паважалі закон і правы адзін аднаго. У прынцыпе, гэта ідэя не маргінальнай апазыцыі, а абсалютнай большасьці грамадзянаў любой краіны, уключна з Расеяй. Іншая справа, што тая большасьць пакуль яшчэ не асэнсавала ўвесь цынізм улады, для якой больш не існуе закону.

Расейская ўлада спрабуе задушыць пратэст у зародку. Спаўзаньне краіны ў аўтарытарызм будзе паскарацца. Нягегла змагаючыся з каляровымі рэвалюцыямі ў суседніх краінах, Пуцінскі рэжым не заўважыў, як сам падхапіў рэвалюцыйны вірус. Разганяючы «Марш нязгодных», расейская ўлада ўскосна пацьвердзіла, што незадаволеных у краіне, насамрэч, нашмат болей за паўтары тысячы чалавек.

Гары Каспараў спадзяецца, што цяпер настаў хісткі момант для рэжыму — Пуцін баіцца прызначыць моцнага пераемніка, каб ня страціць асабістых гарантыяў, а таксама баіцца прызначыць слабога пераемніка, каб не пахіснуўся рэжым. У гэты няпэўны момант апазыцыя можа мець шанец. Разам з тым, нават у параўнаньні зь Беларусьсю, сытуацыя ў Расеі прыгнятае сваёй адчайнай безнадзейнасьцю. Пуцін — гэта толькі маска, увасабленьне спэцслужбоўскага клану, які захапіў усю ўладу ў краіне. Супрацьстаяць яму — нібы змагацца з атрутным паветрам, якое, хоць і нябачнае, адчуваецца паўсюль. Пэрманэнтныя праблемы запраграмаваныя ў самой будове расейскае дзяржавы. Вырашыць іх здольная толькі звышадказная грамадзянская супольнасьць. А такой у расейскай гісторыі яшчэ не было.

Цікава, хто пасьля разгону «Маршу нязгодных» будзе ўсур’ёз абмяркоўваць магчымасьць дэмакратызаваць Беларусь з дапамогай Расеі? І ці будуць новыя спробы стварыць «прарасейскую дэмакратычную апазыцыю» ў Беларусі?

Надыходзяць неспрыяльныя часы для беларускіх аматараў паспэкуляваць на «расейскай тэме». Прыходзіць разуменьне, што неабавязкова быць прарасейскім палітыкам, каб быць салідарным з Расеяй. Мы пабачылі, што там ёсьць падобныя да нас людзі. Яны таксама патрабуюць свабоды, і іх таксама за гэта зьбіваюць. Што да экзотаў накшталт нацыянал-бальшавікоў, дык па меры ўзмацненьня грамадзянскага складніку «Іншай Расеі», іх ідэі будуць няўхільна губляць вагу у агульнай масе аб’яднанай грамадзянскай супольнасьці.

У той жа час пагружэньне Расеі ва ўнутраныя палітычныя праблемы здольнае адцягнуць увагу расейскіх уладаў ад Беларусі, што павялічвае шанцы на перамены ў нашай краіне.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Цэнтар цяжару

У любога паселішча ёсьць сэрца. Сэнсавы цэнтар. Месца, якое найбольш ясна выяўляе повязь гісторыі й сучанасьці, і сьведчыць пра дух, што пануе сярод жыхароў.

У сэрцы Малога Сітна разьмяшчаюцца могілкі.

Не, на мапе ўсё прыгожа: геаграфічны плян Сітна нагадвае сонца. Абапал кола, утворанага трыма галоўнымі вуліцамі, тоўпяцца сельсавет, крама, пошта, леспрамгасаўскі гараж, фэльчарска-акушэрскі пункт ды абэліск з чырвонай зоркай (на тым месцы, дзе калісьці стаяла царква), а на прамянях-дарогах, што разыходзяцца ў розныя бакі, — рагі хатаў ды леспрамгасаўскія спаруды. Але ў самім сонечным коле — вялікі пагост. Так ці інакш усе вясковыя шляхі ды сьцежкі скрыжоўваюцца на могілках. Сьвяты масава адзначаюцца тут сама, за адмысловымі сталамі. Ды й галоўная вясковая будоўля цяпер тут: штогод да нэкропалю дадаюцца цэлыя кварталы пахаваньняў. І штаб мясцовае ўлады, і ўстанова аховы здароўя, і агмяні спажывецкае цывілізацыі, і індустрыйны комплекс асуджана пазіраюць, як пашыраецца сіценскі *цэнтар*.

Тым часам на саміх могілках ідзе стоенае змаганьне сымбаляў і сэнсаў: саўковага кшталту помнікі канкуруюць з усё больш пашыранымі крыжамі, а тут сама, наўзбоч (бо цэнтар жа!) раскладваюць тавар аўталаўнікі ды заежджыя гандляры.

У маленькім сэрцы Малога Сітна адбываецца ўсё тая ж нябачная бітва, што і ў сэрцах вялікіх беларускіх гарадоў.

За савецкім часам у цэнтрах *местаў* ды *мястэчак* панавала пустэча. Храмы, ратушы ды іншую ідэалягічна варожую архітэктуру руйнавалі, і чыгунны Ільліч пільна сачыў, каб утвораную сакральную пустку люд запаўняў толькі на афіцыйныя камуністычныя сьвяты — 1 траўня ды 7 лістапада. Калі ў эўрапейскіх гарадох цэнтар спрадвеку згрудажаны, запоўнены, зьместоўна моцны — у БССР было заведзена ганарыцца адсутнасьцю аўтамабільных затораў, найвялікшымі ў сьвеце плошчамі

## ХРОНІКА

### 11 красавіка

#### У Гомелі папярэдзілі

Абласная пракуратура інкрымінуе **Сяргею Несьцяровічу** парушэньне закону аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях. Яму закідаюць сыстэматычнае ладжаньне сходаў незарэгістраванай рэлігійнай суполкі ў сваёй кватэры, зборы грашовых сродкаў. Пракуратура называе суполку брацтвам у гонар Перамяненьня Гасподня. Паводле Несьцяровіча, плынь з такой назвай зьявілася ў Расеі. Брацтва, заснаванае айцом Г.Качатковым, яднае некаторых вернікаў праваслаўнай царквы.

Пракурорскі работнік **Елісееў** не пазнаёміў С. Несьцяровіча з матэрыяламі справы, бо меў ужо гатовае афіцыйнае папярэджаньне.

### 12 красавіка

#### Кадэбэшнікі маскіруюцца

10 красавіка ў Гомелі невядомыя ў цывільным затрымалі студэнтку стыпэндыяльнай праграмы Каліноўскага **Вольгу Дзьмітрук**. Яе дапытвалі пра гомельскіх моладзевых актывістаў, перадусім тых, хто цяпер за мяжой. Дзяўчыне, зь яе словаў, прапаноўвалі супрацоўніцтва і пагражалі.

12 красавіка **Тацьцяну Дзьмітрук**, маці Вольгі, нечакана выклікаў на працу начальнік. Жанчына працуе ў бальніцы. У кабінэт зайшоў невядомы мужчына, які назваўся гомельскім супрацоўнікам газэты «Советская Белоруссия». Ён спрабаваў весьці гутарку пра дачку. Пасьля сыходу невядомага ў жанчыны пачаліся праблемы на працы.

### 13 красавіка

#### Гамельчука прымусілі

У выніку адміністрацыйнага ціску гомельскі актывіст АГП **Мікалай Калюка** адазваў подпіс пад заяўкай на пікет, які плянуецца ў Гомелі 26 красавіка. З вышэйшай інстанцыі намесьніку дырэктара па ідэалёгіі некалькі разоў тэлефанавалі і прасілі, каб падначалены Калюка зьняў подпіс. Тэлефанавалі і дахаты Калюку. Актывіст аднёс заяўку начальніку ўпраўленьня ідэалёгіі па Гомельскай вобласьці **Кацілу**, пазначыўшы, што адмаўляецца быць ініцыятарам пікету.

#### Вярхоўны суд адмовіў

Вярхоўны суд не задаволіў скаргу Саюзу палітычных партыяў «Саюз левых партыяў» на адмову Мінюсту зарэгістраваць арганізацыю.

#### Мілінкевіча не пускаюць

Першы тэлеканал адмовіў лідэру апазіцыі **Аляксандру Мілінкевічу** ў жывым эфіры 25 красавіка. А.Мілінкевіч пісьмова зьвярнуўся да старшыні Тэлерадыёкампаніі **Аляксандра Зімоўскага** з просьбай даць яму, экспэртам і ліквідатарам эфір 25 красавіка а 18-й, каб «даць незалежную ацэнку дзейнасьці дзяржаўных органаў па пераадоленьні наступстваў Чарнобыльскай аварыі».

### 14 красавіка

#### Да Казуліна не даходзяць

Падчас сустрэчы з адвакатам **Аляксандар Казулін** адзначыў, што да яго апошнім часам не даходзяць нават некаторыя заказныя лісты і лісты з апавяшчэньнямі. Тое, што даходзіць, падвяргаецца цэнзуры. Па словах адваката, А.Казулін паранейшаму знаходзіцца на рэжыме дыетычнага харчаваньня «5Б».

#### Садоўскую могуць вызваліць

Праваабаронца **Кацярына Садоўская** паведаміла ў лісьце дамоў, што турэмная камісія рэкамэндуе для яе ўмоўна-датэрміновае вызваленьне. Зь яе ўзялі падпіску, што нікога ня будзе «зьняважаць». К.Садоўская асуджаная да двух гадоў зьняволеньня за зьнявагу судзьдзі.

### 17 красавіка

#### На Радуніцу памянулі

У памінальнай акцыі ў Курапатах прынялі ўдзел некалькі дзясяткаў чалавек — прадстаўнікі інтэлігенцыі, моладзі, рэпрэсаваныя і іх родныя. 29 красавіка па ўсёй Беларусі пачнуцца штомесячныя акцыі памяці ахвяраў сталінізму ў месцах іх масавага зьнішчэньня.

#### Гумінскага цягаюць

**Сержука Гумінскага** судзілі 17 красавіка ў аршанскім гарадзкім судзе, незважаючы на выходны дзень. Судзьдзя **Сяргей Бондараў** прызнаў яго вінаватым у дробным хуліганстве і даў 12 сутак арышту. Афіцыйная прычына затрыманьня — нецьвярозы стан і брыдкаслоўе. Мэдычная экспэртыза не пацьвердзіла ўжываньня Гумінскім алькаголю. Паплечнікі актывіста лічаць затрыманьне прэвэнтыўным — каб хлопец ня ўдзельнічаў у акцыі 28 красавіка, прысьвечанай Чарнобыльскай трагедыі.

**СП**

ды забаронай паспалітаму люду на гэтых плошчах зьбірацца. Да цяпер пустое савецкае сэрца да апошняе кроплі крыві бароніцца ад наступу офісаў, крамаў, кавярняў ды паркінгаў — і супраціўляецца аднаўленьню храмаў.

Так заўжды было ў пераходныя эпохі: гарадзкі цэнтар ператвараецца ў цэнтар цяжару прыняцьця гістарычнага рашэньня.

І вось па ўсёй краіне распачынаецца сапраўдная вайна за дамінаваньне ў цэнтры. Ідзецца нават ня столькі пра цану квадратнага мэтру дарагое зямлі або прэстыж — гаворка пра тое, што надалей стане восьсю беларускага жыцьця.

У Віцебску на месцы царквы Параскевы Пятніцы, разбуранай бальшавікамі, плянуюць будаваць забаўляльны комплекс. У Горадні пракладаюць каналізацыю праз падмуркі сярэднявечных храмаў і руйнуюць унікальныя будынкі дзеля будаўніцтва даходных муляжоў. У Берасьці зачыняюць «Стары Горад», што дамагаўся аднаўленьня гістарычнага места.

Але найбольш вострае сутыкненьне адбываецца цяпер у сэрцы Менску, у самай сярэдзіне Верхняга Гораду. Былы манастыр бэрнардынцаў, адабраны ў Касьцёлу пасьля паўстаньня Каліноўскага й за саветамі ператвораны ў архіў, цяпер зьбіраюцца перабудоўваць у гатэль. Вось ужо трэці год вернікі менскіх касьцёлаў ды грэка-каталіцкіх парафіяў штовечар а 19-й моляцца за вяртаньне сьвятыні. Менавіта гэтак — малітваю, постам і грамадзкімі акцыямі — яшчэ ў камуністычнай Беларусі сьвятары ды вернікі дамагаліся вызваленьня Чырвонага Касьцёлу й Катэдры. Але цяпер на месца ў менскім сэрцы прэтэндуюць не адно саўковы пыл ды шэрасьць, але яшчэ й элегантны грашавіты глямур — пяцізоркавы гатэль з казіно і саўнай. Скварка ў чакалядзе.

Супольная малітва, стаяньне ля сьценаў ды збор подпісаў за вяртаньне Касьцёлу сьв.Язэпа — справа ўсіх беларускіх патрыётаў ды вернікаў усіх канфэсіяў. Ацаленьне беларускага сэрца сёньня адбываецца менавіта тут.

Бо насамрэч змаганьне за сьвятыню ў цэнтры Менску — гэта змаганьне за сэрца кожнага беларуса. Вызначэньне, што ж запануе ў храме нашае душы.

Выгнаньне гандляроў з Храму — 2000 гадоў таму з гэтага ўжо пачыналася адно нацыянальнае абуджэньне.

*Малое Сітна*

Змаганьне за Сьвятога Язэпа — гэта і змаганьне за сэрца кожнага беларуса.

## ХРОНІКА




**16 красавіка моладзь правяла акцыю за вяртаньне касьцёла Сьвятога Язэпа вернікам.**

# Павольны Апакаліпсіс




**Глеба ля адной зь менскіх ТЭЦ.**

Экалягічны крызіс набліжаецца, прымушаючы нас ня толькі трымцець у жаху, але і мабілізоўвацца

Яна побач. Мы ўжо адчуваем яе — падчас студзеньскай адлігі ды ліпеньскіх халадоў, падчас незразумелага ўрагану ды раптоўнай засухі. Гэта — зьмена клімату.

Ніколі раней так шмат не казалі пра ахову навакольля, як сёлета. Усім заўважна: тэмпэратурныя зьмены ідуць хутчэй, чым мы думалі. У 1980-я г. «зялёныя» ідэі былі модай, у 90-я яны зрабіліся банальшчынай, а цяпер — інструмэнтам вялікай палітыкі. Бо прыпякло. Доказ гэтаму — справаздача Міжурадавай камісіі па справах зьмены клімату (IPCC), якая аб’ядноўвае больш за сто дзяржаваў. Яе галоўная выснова: калі мы і надалей будзем сядзець, склаўшы рукі, то нас чакае павольны Апакаліпсіс.

У найбліжэйшыя дзесяцігодзьдзі, — сьцьвярджаюць навукоўцы, — найбольш пацерпяць найбяднейшыя краіны, у асноўным афрыканскія і азіяцкія. Да 2050 г. ад 1 млрд. да 3,2 млрд. людзей будуць пакутаваць ад недахопу вады, а 200—600 млн — ад голаду. З-за разбуральных надворных катаклізмаў штогод будуць гінуць некалькі мільёнаў чалавек. Зьнікнуць каралавыя рыфы і лясы Амазонкі. Лядовыя шапкі ў Арктыцы ды Антарктыдзе растануць, узровень акіяну падвысіцца, агрomністыя тэрыторыі будуць затопленыя. Зьмены будуць адбывацца настолькі хутка, што экасыстэмы не пасьпеюць да іх адаптавацца, у выніку чаго могуць вымерці 30 адсоткаў відаў расьлінаў і жывёлаў. У Эўропе з найбольшымі праблемамі сутыкнуцца міжземнаморскія краіны, якія будуць пакутаваць ад гарачыні ды нястачы пітной вады. Гэта прывядзе, акрамя ўсяго іншага, да заняпаду турызму ды пагаршэньня ўзроўню жыцьця на кантынэнце.

Каб спыніць кліматычныя зьмены, прамысловыя краіны павінныя зьменшыць выкіды ў атмасфэру на 80% да 2050 г. Лічба фантастычная. Гэтак, каб дасягнуць такіх паказчыкаў, Нямеччыне, адной з найбольш прасунутых у экалягічным пляне краінаў, патрэбна штогод інвэставаць 4 мільярды эўра ў далейшае разьвіцьцё альтэрнатыўных крыніцаў энэргіі. Але калі не рабіць нічога, то кліматычная катастрофа будзе каштаваць Нямеччыне ажно 100 мільярдаў эўра штогод.

Што канкрэтна трэба рабіць, каб спыніць пацяпленьне? Выратавальная формула — дэцэнтралізаваная, аднаўляльная ды эфэктыўная энэргетыка. Будаваць сучасныя заводы ды цеплаэлектрастанцыі, аўтамабілі, якія спажываюць мала паліва, ды добра ізаляваныя дамы. А таксама, на ўсякае ўсё, выводзіць харчовыя расьліны, якія здолеюць вытрымліваць падвышаную тэмпэратуру. Японія ўжо пастанавіла стварыць новы, цеплаўстойлівы гатунак рысу.

## Азеляненьне палітыкі

Справаздача суправаджалася цэлым шэрагам скандалаў, выкліканых найперш тым, што дэлегацыі з Саудаўскай Арабіі, Расеі ды Кітаю патрабавалі ад навукоўцаў выкінуць з тэксту пэўныя пункты. ЗША таксама рабілі немалы ціск. З буйных «псавальнікаў паветра» толькі аб’яднаная Эўропа мае палітычную волю прызнаць праблему. Больш за тое — кліматычныя зьмены непасрэдна ўплываюць на саму эўрапейскую палітыку.

Яскравы прыклад — Дэйвід Кэмэран, узыходзячая зорка брытанскай палітычнай сцэны. Ён, бадай, першы палітык-кансэрватар у Эўропе, які робіць

кар'еру, грунтуючыся на «зялёных» ідэях.

Кэмэран — вядучы кандыдат на пасаду прэм'ера ад кансэрватыўнай партыі. «Зьмена клімату — гэта наш цяжар абавязку перад наступным пакаленьнем», — кажа ён у сваіх выступах. Кэмэран кажа ня толькі пра падаткі, але і пра насарогаў ды белых мядзьведзяў, якія могуць зьнікнуць па віне людзей, якія бяздумна карыстаюцца абмежаванымі рэсурсамі «нашага агульнага дому». Гэта — нечуваныя словы для кансэрватараў, якія традыцыйна абапіраюцца найперш на асабісты інтарэс чалавека, а не на грамадзкую супольнасьць. Раней кансэрватары абаранялі буйны бізнэс. Цяпер ім даводзіцца думаць пра звычайных людзей — бо калі ўмовы іх існаваньня зробяцца невыноснымі, пра які бізнэс можна будзе весьці гаворку?

Калі ўжо кансэрватары ўсур'ёз узяліся за клімат, дык лейбарысты — тым болей. Тоні Блэр, відавочна, канчаткова вырашыў сысьці з пасады прэм'ера «зялёным» палітыкам і ўжо пасьпеў параўнаць барацьбу з наступствамі глябальнага пацяпленьня са змаганьнем з фашызмам і камунізмам. Брытанія зрабілася першай краінай у сьвеце, якая заканадаўча абавязалася зьменшыць свае выкіды вуглякіслага газу ў атмасфэру на 60% да 2050 г. Калі будучыя ўрады краіны не дадуць рады гэтай задачы, іх будуць чакаць штрафныя санкцыі.

У іншых краінах Захаду правыя таксама бяруць на ўзбраеньне традыцыйна «левую» тэму аховы навакольля. Калі Ангела Мэркель у сваёй перадвыбарчай кампаніі 2005 г. абыходзіла «зялёныя» праблемы, дык цяпер яны занялі сталае месца ў яе прамовах. Тое самае можна сказаць і пра Нікаля Сарказі, кандыдата ў прэзыдэнты Францыі. Нават у ЗША ў экалягічна пасіўным асяродку кансэрватыўнай партыі пачала вымалёўвацца плынь «зялёнагаловых».

«Зелянеючы», кансэрватары пакрысе зьмяняюць сваю палітыку і ў іншых сфэрах — гэтак, яны ўжо ня ставяцца так варожа да падвышэньня падаткаў. Бо трэба ж аднекуль, урэшце, браць грошы на экалёгію! Ва ўмовах, калі правыя ды левыя на Захадзе робяцца ўсё больш падобнымі адзін да аднаго, менавіта іх стаўленьне да экалягічных праблемаў можа адыграць важную ролю ў перамогах на выбарах. Парадаксальна, але ўласна «зялёныя» партыі ў такіх умовах пачынаюць губляць харызму — іх ідэі, якія раней падаваліся арыгінальнымі, цяпер робяцца палітычным «мэйнстрымам». Ніколі раней экалёгія не была такой важнай, як цяпер, калі яна зрабілася стрыжнёвай праблемай барацьбы за ўладу. Эколягі з экспэртаў-кансультантаў ператвараюцца ў палітычных лідэраў.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Прадпрыемства па выпальваньні вугалю на Меншчыне.**

## Беларусь і пацяпленьне

У экалягічных праблемах апошняга часу адчуваецца вялізная несправядлівасьць. Вось ужо колькі дзесяцігодзьдзяў «залаты мільярд» (насельнікі разьвітых індустрыяльных краінаў) жыве ў камфорце, пакуль большая частка плянэты жабруе ды недаядае. І камфорт гэты дасягнуты найперш коштам эксплюатацыі агульных зямных рэсурсаў, якімі багатыя краіны карыстаюцца настолькі неэфэктыўна, што здолелі незваротна забрудзіць атмасфэру. Але пакутаваць ад гэтага нядбайства будуць зноў-такі найперш людзі з «трэцяга сьвету». Радуе толькі тое, што «залаты мільярд» разьвіваўся ня толькі індустрыяльна, але і духоўна, і цяпер здольны, хоць і праз скрыгат зубоў, прызнаць сваю віну ды спрабаваць неяк выправіць сытуацыю.

А што мы, эўрапейская нацыя, якая называе сябе беларусамі? Зьбіраемся ўехаць у экалягічна чысты сьвет зайцамі? Ці будуюцца энэргаашчадныя дамы ў нашых аграгарадках? Колькі ветракоў-электрагенэратараў мы паставілі на нашых палетках? Дзе наш біядызэль з рапсавага алею? Куды пайшлі рэсурсы ад спэкуляцыяў на таннай нафце ды спажываньня таннага газу?

На жаль, мы не скарысталі з магчымасьцяў для стварэньня экалягічна эфэктыўнай энэргетыкі. Замест гэтага, краіна недаравальна марнавала рэсурсы на падтрыманьне неэфэктыўнай вытворчасьці ў больш-менш прытомным стане. Мы забруджваем атмасфэру меней за індустрыяльныя краіны не таму, што маем сучасныя заводы, а з прычыны нашай адсталасьці. І нават калі Беларусь, у адпаведнасьці з Кіёцкім пратаколам, пачне прадаваць за мяжу свае квоты на шкодныя эмісіі ў паветра, грошы тыя пойдуць найперш на тое, каб «запусьціць заводы», неэфэктыўныя ды брудныя. Сёньняшнім днём жывём. У сучасным сьвеце гэта — дзікунства, а ў Эўропе і пагатоў.

Экалёгія — праблема, якая датычыць усіх краінаў. І змагацца за выжываньне давядзецца разам. Ужо проста думаць пра гэта — значыцца рабіцца грамадзянінам. Спачатку мы задаём сабе пытаньне: «Ці выключаю я сьвятло, якое гарыць без патрэбы?», потым заўважаем, што ў нашым двары так і няма абяцаных уладамі кантэйнэраў для плястыкавага сьмецьця, і, нарэшце, задумваемся: «Што робіць дзяржава з падаткамі, якія я ёй аддаю? Ці ідуць гэтыя грошы на тое, каб мае праўнукі маглі жыць у чыстым навакольлі?» Разважаючы такім чынам, мы перакрочваем межы свайго эгаізму, свайго дому, краіны, больш ясна бачым сваё месца ў сьвеце. Вырашыць гэтыя праблемы можна толькі разам. Магчыма, сусьветнае пацяпленьне адбудзецца ня толькі ў атмасфэры, але і ў нашых сэрцах.

**Алесь Кудрыцкі**



**...Ён быў лідэрам расейскай апазыцыі.**

— Мы пачынаем Марш нязгодных з замежнай крэдытнай палітыкай Расеі!



**...Індыя сапраўды была гонарам беларускай замежнай палітыкі.**

— Мартынаў добры дыплямат, аднак часам занадта ганарлівы.



**...ва ўкраінскай Вярхоўнай радзе засядалі дэпутаты палаты прадстаўнікоў.**

— Канстытуцыйны суд Украіны прыняў да разгляду пазоў дэпутатаў аб неправамернасьці роспуску Рады. Дэпутаты абражаныя тым, што прэзыдэнт своечасова не загадаў ім самім скласьці мандаты.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# АЭС паўстане сярод балотаў




На Радуніцу Зьміцер Панкавец і Арцём Лява наведалі вёскі на сутыку Быхаўскага, Чавускага і Слаўгарадзкага раёнаў, дзе мае будавацца беларуская АЭС.

Некалі Бахань была пэрспэктыўнай вёскай у Слаўгарадзкім раёне, мела колькі сотонь двароў, школу, дзіцячы сад, больніцу — цэнтар сельсавету як-ніяк. Жыцьцё віравала. Сёньня на карце вёска пазначаная як «нежылая».

У Бахані адразу згадваецца Максім Багдановіч: «няма таго, што раньш было». Усё зарасло быльнягом, кустоўем. Кінь запалку — спаліш вёску: столькі сухой травы.

У тым, што Бахані болей няма, вінаваты Чарнобыль. У красавіку 1986 г. паўночны захад Слаўгарадчыны быў моцна забруджаны, вёскі прымусова перасялялі.

## Чыстая Быхаўшчына

«Радыяцыя? Хто яго ведае, пэўна, і ў нас ёсьць», — разважліва адказвае ён. На выгляд Мікалаю гадоў 50—60, паліць цыгарэту, усьміхаецца гнілымі зубамі. Выпіўшы крыху — Радуніца ж.

Мікола — жыхар вёсачкі Ліповіцы на мяжы Быхаўскага і Слаўгарадзкага раёну, пяць кілямэтраў ад Бахані. У вёсцы засталося два двары.

Па гравійцы ў бок Слаўгарадчыны едуць «мэрсы» ды «аўдзі» зь менскімі нумарамі. На могілкі, у «зону».

Але пераважна людзей з забруджанай Слаўгарадчыны перасялялі ня ў Менск, а па суседзтве, на Быхаўшчыну.

«І я пераехаў у Сялец, — кажа Мікола. — Тут маці старая жыла, больш за 80 гадоў пражыла, гады чатыры назад памёрла, я сюды і вярнуўся. Жонка ў Магілёў зьехала, я адзін па гаспадарцы». — «А вялікая гаспадарка?» — «Два сабакі, кот, пара курэй і гусей. Градкі саджаем, гуркі, памідоры». — «Не баіцеся есьці?» — «Чаго баяцца ўжо».

Чаго ім баяцца, тым, хто 21 год пражыў сам-насам з радыяцыяй. Гэта мы, госьці, баімся лішні раз чаго кранунцца.

«Ня трэба мяне фатаграфаваць, — кажа Мікола. — Кожны год нехта прыяжджае і фатаграфуе. Я ж не для таго расказваю, а проста пагаварыць з кім хочацца».


АРЦЁМ ЛЯВА

**Пакуль тая АЭС, каля Краснай Паляны здабываюць торф.**

Як і журналісты, раз на год, прыяжджаюць мэдыкі: флюараграфія, аналізы. Вынікаў Мікалай ня ведае.

А што перажываць, калі вакол сеюць. Як стаў Лукашэнка, загадалі апрацоўваць палі. Палянавіцкае СПК «Расея» культывуе «брудныя» баханскія палі, там і каровы пасуць.

## Зразумелае маўчаньне

35 кілямэтраў ад Ліпоўніцы на поўнач Быхаўшчыны — вёска Баўкі на сутыку Быхаўскага, Чавускага і Слаўгарадзкага раёнаў. Тут, на краснапалянскай пляцоўцы, маюць будаваць атамную станцыю.

Ля першай хаты ў Баўках сядзяць чацьвёра мужыкоў. Дазнаўшыся, што мы едзем глядзець атамную станцыю, яны наперабой расказваюць. «Ад студзеня геолягі тут сядзелі. Разьметку зрабілі». Пра будаўніцтва дазналіся з раёнкі. «Хто нам што скажа. Нічога ж не сказалі, як перасталі плаціць «чарнобыльскія».

Паўвёскі адсялілі ў 90-я. У Баўках было 900 жыхароў, сёньня 35. Пяцёх малых возяць аўтобусам у школу ў Смоліцы, там аграгарадок. А ў Баўкі са Смоліц возяць даярак, бо тут фэрма.

«26-га ў Быхаў Лукашэнка прыяжджае, хай бы лепей сюды прыехаў, што тут робіцца. Дык не прыедзе». А за каго галасавалі? «За Лукашэнку, за каго ж яшчэ! Апроч яго, альтэрнатывы няма».

А ці хочуць, каб тут будавалася АЭС? Маўчаць, ня ведаюць, што адказаць. Час ісьці ўжо на могілкі, кажа вясковец. «Да брата яго роднага пойдзем, — працягвае, паказваючы на другога. — 46 гадоў было, сэрца спынілася. З тых, каго перасялілі з Баўкоў, жывых не засталося».

Ямо чырвоныя яйкі. Ня бойцеся, кажуць, не вясковыя, без радыяцыі, з Быхава.

## Толькі танкам

Беларускую АЭС будаваць муць сярод балотаў. У Баўках здабываюць торф, да распрацовак падведзеная вузкакалейка. Мэліярацыйныя каналы паўсюль. Лес сасновы зь бярозавым. У машыну нейкім чынам трапілі два кляшчы, іх у гэтых лясох нямала. Мядзьведжы куток, куды ні з Чавусаў, ні з Быхава, ні з Слаўгараду не вядуць праезныя дарогі. Спрабуем даехаць да пляцоўкі, што знаходзіцца між Баўкамі, Давыдавічамі і Краснай (значыць, харошай, прыгожай) Палянай. Не здаецца: на легкавіку немагчыма.

Цяжка ўявіць, што ў гэтай глушы ў 2011 г. будзе атамная станцыя.

Вяртаемся ў сталіцу, чытаем: «Расея гатовая ўдзельнічаць у будаўніцтве атамнай электрастанцыі на тэрыторыі Беларусі, паведаміў сёньня надзвычайны і паўнамоцны пасол Расейскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандар Сурыкаў, адказваючы на пытаньне карэспандэнта БелТА аб пэрспектывах міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў атамнай энэргетыцы. На яго думку, расейскі бок здолеў бы забясьпечыць праектныя працы, выраб і мантаж тэхналягічнага абсталяваньня, у тым ліку і рэактара. Акрамя таго, Расея гатовая даць Беларусі крэдыт на рэалізацыю праекту». Карацей, толькі будуйце, і толькі на расейскім уране.



**Памёр Курт Вонэгут, амэрыканскі пісьменьнік. «Фантаст» — часта, і абсалютна дарэмна, дадаюць. Яго фантастыка — фантастыка навіннай стужкі. І яго плянэта Тральфамадор ня большая фантастыка за бамбаваньне Дрэздэна ангельскай авіяцыяй у 1945-м, калі ваеннапалонны амэрыканскі немец Вонэгут цудам выжыў.**
**Пагодак Васіля Быкава, Вонэгут напісаў пра вайну адзін раман. Яму ня трэба было, як Быкаву, ўсё жыцьцё адстойваць права пісаць пра вайну праўду. Затое амэрыканец Вонэгут, каб выжыць і ўтрымаць сям'ю, гандляваў машынамі, працаваў рэпарцёрам, сакратаром па сувязях з грамадзкасьцю, яго апавяданьні друкаваў «Плэйбой», калі іх ніхто не друкаваў.**
**Дрэздэнская бамбёжка пакінула ў ім назаўжды адчуваньне ўмоўнасьці жыцьця — умоўнасьці мэтаў, задачаў, сродкаў і, галоўнае, умоўнасьці выніку. Чаму цывілізацыя ня можа існаваць дзеля мэты, апісанай у «Сырэнах Тытана»? А чалавек ня можа ператварыцца ў тое, што апісваецца ў «Галапагосах»? Усё ж пачыналася так рэалістычна. «Кім трэба быць, каб распрацоўваць атамную бомбу, калі у цябе жонка — пэдыятар? І што гэта за доктар , што гэта за жанчына, якая не разьвядзецца з мужам, у якога настолькі зайшлі шарыкі за ролікі?» — пісаў Вонэгут пра акадэміка Сахарава, савецкага дысыдэнта і куміра 70-х.**
**Свае 84 гады Вонэгут пражыў неверагодным жыцьцялюбам — як доктар Франсуа Рабле, што да глыбокай старасьці балянсаваў між пошасьцю і інквізыцыяй. Апошнія гады Вонэгут жыў на мысе Код, крытыкаваў Буша і многа паліў. Разам зь ім зьнік яшчэ адзін масток у дваццатае стагодзьдзе.**

# Бойня №5, або Крыжовы паход дзяцей

урыўкі з раману

**КУРТ ВОНЭГУТ**

Як спэц у стварэньні завязак, разьвязак, трапных характарыстык, як адмысловец у сакавітых дыялёгах і напружаных сцэнах, як знаўца псыхалёгіі супрацьстаяньня, я шмат разоў рабіў плян маёй кнігі пра Дрэздэн.

Найлепшы ці, прынамсі, найпрыгажэйшы накід, які я зрабіў, быў на адваротным баку шпалераў.

Я скарыстаўся каляровымі алоўкамі маёй дачкі — асобны колер для кожнага вобразу. Адзін канец шпалернага адрэза стаў пачаткам, другі — канцом, а сярэдняя частка, адпаведна, — сярэдзінай кнігі. І блакітная лінія сутыкалася з чырвонай, і потым з жоўтай, і жоўтая спынялася, бо герой, пазначаны жоўтай лініяй, паміраў. І гэтак далей. Разбурэньне Дрэздэну я пазначыў вэртыкальна намаляванай палоскай, заштрыхаванай ў аранжавае, ды чынныя лініі мусілі прайсьці гэты расьцяроб.

Канцом, там, дзе спыняліся ўсе лініі, было бураковішча ля Эльбы, недалёка ад Гале. Ішоў дождж. Вайна ў Эўропе ўжо пару тыдняў як скончылася. Мы стаялі пашыхтаваныя ў шэрагі, ды канвой савецкіх жаўнераў суправаджаў нас: ангельцаў, амэрыканцаў, галяндцаў, французаў, канадцаў, паўднёваафрыканцаў, новазэляндцаў ды аўстралійцаў. Тысячы людзей, якія неўзабаве мелі перастаць быць ваеннапалоннымі.

А на другім баку поля стаялі тысячы савецкіх, польскіх ды югаслаўскіх палонных жаўнераў пад амэрыканскім канвоем. І пад дажджом адбыўся абмен: за аднаго палоннага — аднаго палоннага. О'Гэйр і я ўлезьлі ў кодаб амэрыканскага грузавіка зь дзясяткамі іншых жаўнераў. О'Гэйр ня меў аніякіх трафэяў. Амаль усе астатнія мелі. Я прыдбаў парадную шаблю афіцэра Люфтвафэ, яна дагэтуль захавалася. Адзін утрапёны амэрыканец, якога я назваў у гэтай кніжцы Пол Лацара, меў добрую жменю дыямантаў, смагардаў і рубінаў. Ён зьбіраў усё гэта па дрэздэнскіх лёхах у мёртвых людзей. Во як.

(...) І нас павезьлі ў рэабілітацыйны шпіталь у Францыі, дзе кармілі чакалядай, малочна-соладавымі кактэйлямі ды іншымі пажыўнымі прадуктамі, пакуль мы ўсе не нагулялі трохі маладога сала. Потым нас адправілі дадому, і я ажаніўся з прыгожай дзяўчынай, якую адразу пасьля вайны таксама вазілі нагуляць трохі маладога сала.

І ў нас нарадзіліся дзеткі.

(...) Незадоўга перад сьмерцю мой бацька сказаў мне: «Ведаеш, у тваіх кнігах ніколі не было адмоўных герояў».

Я адказаў яму, што гэтага я навучыўся ва ўнівэрсытэце.

Калі я вучыўся быць антраполягам, дык падрабляў тым, што вёў крымінальную хроніку ў вядомай інфармацыйнай агенцыі Chicago City News Bureau за дваццаць восем даляраў у тыдзень.

Нас фінансавалі ўсе гарадзкія газэты, інфармацыйная агенцыя Associated Press, турыстычнае бюро возера Мічыган. Мы мусілі даваць рэпартажы з судоў, пасылаць зьвесткі з паліцэйскіх пастарункаў, пажарнай службы і да таго падобных устаноў. Сувязь з арганізацыямі-фундатарамі мы трымалі праз пнэўмапошту, якая пралягае ў Чыкага пад зямлёю.

Рэпартэр мусіў прадыктаваць паведамленьне па тэлефоне пісару ў навушніках, а пісар выводзіў на кальцы літары па трафарэце. Паведамленьні множылі на мімэографе і пакавалі ў бронзавыя, з аксамітам у сярэдзіне, гільзападобныя скрынкі. Тыя скрынкі глытала пнэўматруба.

Самымі хцівымі акуламі пяра сярод рэпартэраў і пісараў былі жанчыны, якія пазаймалі працоўныя месцы тых мужчынаў, што пайшлі на вайну.

І першае сваё паведамленьне я мусіў прадыктаваць адной з такіх драпежніц.

Бяда здарылася з маладым франтавіком, які атрымаў працу ліфтэра ў адміністрацыйным будынку. Ліфт быў састарэлай мадэлі, калі ў самой «каробцы» дзьвярэй няма — яны ёсьць толькі на паверхах. Дзьверы на другім паверсе аздаблялі ўзорныя чыгунныя пляцёнкі. Чыгунны плюшч на іх выкручваўся мудрагелістым арнамэнтам. Над плюшчом зьвісала чыгунная галінка з двума чыгуннымі папугайчыкамі.

Франтавіку трэба было спусьціцца ў сутарэньне, і ён зачыніў дзьверы ліфта ды націснуў на кнопку старту. Але ягоны заручальны пярсьцёнак нагэтулькі шчыльна зачапіўся за жалезны ўзор, што вэтэрана пацягнула ўгару за ўласнай рукой. Тым часам сам ліфт рушыў долу; падлога рэзка абрынулася з-пад ягоных ног, а столь «каробкі» расплюскала неба-

раку зьверху. Такое здараецца.

Як я гэта ўсё прадыктаваў, дык жанчына, якая запісвала паведамленьне пад трафарэт, спыталася:

— А што сказала ягоная жонка?

— Яна пакуль што ня ведае, — адказаў я. — Гэта здарылася толькі што.

— Затэлефануй і вазьмі ў яе інтэрвію.

— Што?!

— Скажаш, што ты капітан Фін з паліцыі ды ў цябе сумныя весткі. Распавядзі ёй усё і паслухай, што яна скажа.

Я так і зрабіў. Ягоная жонка казала, што і магла сказаць у гэткай сытуацыі. У іх было дзіця. І гэтак далей.

Калі я вярнуўся ў кантору, пісарчучка спыталася яшчэ, так, зь цікавасьці, як выглядаў раструшчаны хлопец.

Я апісаў.

— Табе не зблажэла? — пацікавілася пісарчучка.

Яна ела цукеркі «Тры мушкетэры».

— Зь якой такой халеры, Нэнсі! — адказаў я. — На вайне я бачыў значна жахлівейшыя рэчы.

(...) Ужо тады я абдумваў кнігу пра бамбардаваньне Дрэздэну. У той час у Амэрыцы аб гэтым авіяналёце амаль нічога ня ведалі. Прыкладам, ня шмат амэрыканцаў ведала, што ён быў значна страшнейшым, напрыклад, за Хірасіму. Я таксама пра гэта ня ведаў. Бамбардаваньне Дрэздэну не атрымала шырокага розгаласу. У той час я напісаў ва ўправу вайскова-паветраных сілаў. Прасіў даслаць мне сякія-такія дэталі авіяналёту на Дрэздэн: ад каго сыходзіў загад, колькі самалётаў брала ўдзел, якіх вынікаў чакалі і гэтак далей. Мне адказаў хлопец, які, кшталту мяне, працаваў на пасадзе сакратара па сувязях з грамадзкасьцю. Ён пісаў, што вельмі перапрашае, але інфармацыя пра авіяналёт усё яшчэ застаецца дзяржаўным сакрэтам.

Я прачытаў ліст жонцы ўголас і выгукнуў: «Сакрэтам? Божухна, ад каго?»

Пару тыдняў пасьля гэтага я пазваніў майму аднапалчаніну, Бэрнарду О'Гэйру, ды ўсё ж паехаў наведаць яго. Гэта было, мусіць, у шэсьцьдзесят чацьвертым ці блізу таго, карацей, у апошні год Нью-ёрскай усясьветнай выставы...

(...) З сабой у падарожжа я ўзяў дзьвюх малых дзяўчатак — маю дачку, Нэні, ды яе найлепшую сяброўку, Элісан Мітчэл. Датуль яны ніколі не былі па-за межамі мысу Код. Пад'яжджаючы да ракі, я спыняў машыну, каб дзяўчаты маглі пастаяць ля вады і трохі падумаць аб ёй. Яны раней ніколі ня бачылі вады ў такім доўгім, вузкім ды несалёным выглядзе. Гэта была рака Гадсан. У ёй плавалі карпы, і мы бачылі іх. Яны былі вялізныя, як атамныя субмарыны. Таксама мы бачылі вадаспады, ручаі, якія скакалі з уцёсаў па Дэлаўэрскай даліне. Было шмат чаго, дзеля чаго варта спыніцца ды агледзецца, але трэба было ехаць далей, заўсёды трэба некуды ехаць. «Паехалі, дзяўчаткі. Час!» — казаў я. І мы ехалі далей.

І сонца зайшло, і я пагрукаў у парадныя дзьверы прыгожай камяніцы Бэрнарда О'Гэйра. Я нёс пляшку ірляндзкага віскі, як нясуць абедзенны званок. Я сустрэў ягоную прыязную жонку Мэры, якой прысьвяціў гэтую кнігу. Мэры — дыплямаваная мэдсястра. Як на мяне, дык цудоўны занятак для жанчыны.

Мэры прыйшла ў захапленьне ад маіх дзяўчатак: яна пазнаёміла іх са сваімі дзеткамі ды адпусьціла іх усіх на другі паверх пагуляцца разам ды пaглядзець тэлевізар. І толькі пасьля таго як дзяўчаткі пабеглі сабе, я адчуў, што не падабаюся Мэры або ёй нешта не даспадобы ў сёньняшняй сустрэчы. Яна трымалася ветла, але халадна.

— У вас тут утульна, — прамовіў я, і гэта было праўдай.

— Я прыгатавала месца, дзе вы можаце спакойна пагаманіць, — сказала яна.

— Добра, — адказаў я, уявіўшы два фатэлі ля каміну ў шаляванай гасьцёўні, дзе два старыя жаўнеры могуць выпіць ды пагаманіць сабе. Але Мэры завяла нас на кухню. Пры стале яна паставіла два мулкія крэслы. Стол меў парцалянавую паверхню. Тая паверхня моцна рэзала вочы адбітым сьвятлом, якое сыходзіла з дзьвюхсотватнае лямпачкі. Мэры падрыхтавала нам апэрацыйны пакой. Яна паставіла толькі адну шклянку — для мяне, і патлумачыла, што пасьля вайны О'Гэйру забаранілі браць у губу.

Мы паселі. О'Гэйр быў зьбянтэжаны, але ён не казаў, у чым рэч. Я губляўся ў здагадках, ня ў стане зразумець, што ў маёй пэрсоне так злавала Мэры. У мяне ж сям'я. Першы шлюб, ніколі не было разводаў. Ня жлукта. На вайне ніякіх кепстваў ейнаму мужу не зрабіў.

Калі Мэры кідала сабе лёд у «Кока-Колу», дык нарабіла многа шуму, бразгаючы матрычкай для лёду па чарупіне-нержавейцы. Пасьля Мэры выйшла ў іншую частку дома. Але ж і там не супакоілася. Яна снаўдала па ўсім доме; адчыняла і зачыняла дзьверы; нават ссоўвала зь месца мэблю, каб спагнаць сваю злосьць.

Я спытаў О'Гэйра, што я такога сказаў ці нарабіў, што яна так злуецца.

— Не, не, усё добра, — адказаў ён. — Не пераймайся. Гэта ніяк з табой не зьвязана.

Ён быў літасьцівы да мяне. Ён хлусіў. Гэта было зьвязана менавіта са мною.

Мы паспрабавалі не заўважаць жончынага шуму і пачалі прыгадваць вайну. Я каўтнуў пару кілішкаў свайго віскі. Мы павыскаляліся, успамінаючы сьмешныя эпізоды, але нікому не прыйшло да галавы сапраўды цікавай гісторыі. О'Гэйр прыгадаў, як у Дрэздэне, яшчэ да таго як яго разбамбілі, адзін хлопец натрапіў на некрануты вінны лёх, ды мы вымушаны былі цягнуць таго хлопца ў тачцы.

Але на цэлую кнігу гэтага яўна не хапала. Я прыгадаў двух савецкіх жаўнераў, якія абрабавалі гадзіньнікавы завод. У іх была фурманка, набіткаваная гадзіньнікамі. Ехалі яны падвясёленыя, палілі вялізныя цыгарэты, скручаныя з газэтаў.

Вось, зрэшты, і ўсё, што ўскруцілася тады на розум. А Мэры па-ранейшаму гармідарыла. Нарэшце яна зноў зайшла ў кухню, каб наліць сабе яшчэ шклянку колы. Выцягнуўшы зь лядоўні матрычку, яна гахнула яе ў чарупіну, дарма што лёду там было ўжо дастаткова.

Яна павярнулася, паказваючы сваю злосьць, злосьць на мяне. Яна вяла ўнутраны дыялёг, і тое, што яна сказала ўголас, было толькі часткаю таго дыялёгу:

— Тады вы былі дзецьмі!

— Што? — не зразумеў я.

— У час вайны вы былі малымі дзецьмі — як тыя, што цяпер на другім паверсе!

Я хітнуў на знак згоды. Тады мы былі недапечанымі смаркачамі — акурат пры канцы дзяцінства.

— Але дзе ж ты пра тое напішаш!

Гэта не гучала як пытаньне, гэта гучала як прысуд.

— Я... я ня ведаю, — вымавіў я.

— Дык я ведаю! — сказала яна. — Вы будзеце ўдаваць, што вы былі мужчынамі, а ня дзецьмі, пра вас, герояў, будуць здымацца кінастужкі з Фрэнкам Сінатрам ці Джонам Ўэйнам у галоўнай ролі або зь якім іншым чароўным старпёрам, які палка любіць вайну. І тады войны выглядацьмуць прыгожай казкаю, і ў нас іх будзе яшчэ многа. І на іх пойдуць новыя дзеці, тыя, што на другім паверсе.

І тут я дапяў. Яе раззлавала тэма вайны. Мэры не жадала, каб яе дзеці або чые іншыя дзеці пайшлі на вайну забіваць. І на яе думку, кнігі і кіно робяць свой унёсак, заахвочваючы людзей ісьці на вайну.

Тут я ўзьняў правую руку і ўрачыста паабяцаў ёй:

— Мэры! Наўрад ці я калі-небудзь скончу гэтую кнігу. Я напісаў ужо пяць тысяч старонак ды ўсе выкінуў у сьметніцу. Але калі я ўсё-ткі скончу яе, даю табе слова гонару: у маёй кнізе ня будзе роляў для Фрэнка Сінатры ды Джона Ўэйна.

— Ведаеш што, — дадаў я, — я назаву яе «Крыжовы паход дзяцей».

**З ангельскае пераклаў Павал Касьцюкевіч**

ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ

апавяданьне

# Гурковы цукар

## I. Інтэрнэт

Мама, якая вы ўсё ж тупая! Не хачу я вашых дурных дранікаў. Я хачу на мора, дзе людзі. Пуцёвачка, пікнік, шашлычок. Паесьці нармальных сьвіных крылаў. Хачу-хачу. Во, закажу паездку праз інтэрнэт. «Інцірнет», «інцірнет», мама. Сядзіце ў сваім дваццаць першым стагодзьдзі, як у нары. Як хамяк. Зірніце на вуліцу. Людзі перад інтэрнэтам разьвіваюцца, жыцьцё будуюць. Вось, напрыклад, была тут адна. Вы яе ня ведаеце. Ужо ў гадах, праўда. Прыстойная жанчына. Пачала перапісвацца праз інтэрнэт з адным палякам. Ці хто ён там. Вэтэранам «Салідарнасьці». Туды-сюды, карацей, захапілася жанчынка. Ну, празь месяц прыяжджае паляк у Менск. І акварыюм валачэ. З вадой. І ўсюды стаў яго цягаць з сабой. І ў кіно ўзяў, і нават у рэстарацыю. І раз-пораз, быццам думае — ніхто ня бачыць, ён у гэты акварыюм — р-раз туды сваю галаву. І хуценька дастае як ніяк нідзе. Тыцнуў і далей пайшоў. І так цэлы дзень. І ўжо ў рэстарацыі ёй абрыдла страшна, і яна сказала, што хопіць галаву засоўваць у акварыюм, Лёлек. А ён ёй: «Прабачце, дарагая, не хацеў пакрыўдзіць. Рэч у тым, крулева мая, што я — марскі трытон. У Польшчы нас такіх цэлая суполка». Во як, трытон. Лістуесься з чалавекам і ня ведаеш, хто па той бок перад экранам сядзіць. «І вада, кажа, мне неабходная для маіх жабраў. Вось яны ў мяне — глядзіце». Ну, і паказаў свае жабры. Маленечкія такія дзіркі ў шыі. «І вада ў акварыюме ў мяне марская. З нашага курорта Сопат». А яна што? Яна сказала яму: «Ты, Болек, болей не прыяжджай. Шкындзёхай у сваю Літву, у свой сабачы Талін! Сучок. Зрабіў тут бясплатны хвосьцінг і з інтэрнэтам вычвараецца — галаву людзям дурыць. Выціран сабачы!» — і вываліла ўсю ягоную марскую ваду на падлогу. А паляк? Пайшоў у прыбіральню: наліў зноў у акварыюм вады з-пад крану, пасаліў і цяпер ужо не саромеючыся засунуў туды галаву, патрымаў там яе трохі і зьехаў назад у Польшчу. Не, тады ў мяне яшчэ інтэрнэту не было. Інтэрнэт хто мне ўсталяваў? Ну, памятаеце, заходзіў тады такі паглядны мужчына? Вікінг. Ну, памятаеце, калі я вас у ванным пакоі замкнула, і рукі-ногі пазьвязвала, і скотч на рот наклеіла, каб вы не дундзелі нам у вушы, а яму сказала, што рамонт у ваньне і хай, калі ласка, рукі мые на кухні? У мяне кампутар ужо быў, а інтэрнэту дык німа. «О, кажа, у вас клявіятура для інтэрнэту не падыходзіць». Дык вось, акурат ён мне нараіў памяняць і вінчэстэр. Потым я ў газэце вычытала абвестку: «Прадаецца вінчэстэр. Нядорага». І тэлефончык. У разьдзеле «Рознае». Прыяжджаю. Пад'езьдзік, лесьвічка. Адчыняе такі ў скураной куртцы, лысы. Таксама вікінг. «Я наконт вінчэстэра», — кажу. А ён мне: «Зараз прынясу». І вяртаецца са стрэльбай. Я яму кажу: «Гэта вы мяне зьбіраецеся забіць?» А сама ўжо з жыцьцём разьвітваюся. Я сказала яму (жыцьцю): «Чао, бамбіна! Ты было як песьня». А лысы вікінг мне праз мае думкі: «Не, гэта я зьбіраюся вам прадаць». «А цо гэта за таке? Я ж па вінчэстэр прыйшла, а не па гэта вось». А ён? «Гэта і ёсьць вінчэстэр, гэта такая зброя, у Амэрыцы ўсе паліцыянты зь імі ходзяць». А я яму: «Шо вы кажаце, прама такі ўсе? Каб вы ведалі, мужчына, вінчэстэр — гэта такі кавалак кампутара». Я яму доўга даказвала, што гэта ягоная моцная памылка. Урэшце плюнула і купіла ягоную вэрсію вінчэстэра. І нядорага. Сто восемдзесят. Дзевяць. Ёсьць адсталыя людзі, мама, якія, ну, зусім нічагенькі ня кемяць у інтэрнэце, і няма сэнсу ім нешта даказваць. Іх ужо не памяняеш — застаецца толькі чакаць, калі яны ўсе вымруць, як дыназаўры. Як дыназаўры ад вінчэстэра. Не, «ружжа», мама, я вам не пакажу. Я яго памяняла на «Шмайсэр», і надзейна схавала, і дастану толькі для таго, каб памяняць на М-16. Так, я хачу сабраць калекцыю «Зброя народаў сьвету», але з прычыны абмежаванасьці грашовых сродкаў і нястачы складзкіх памяшканьняў у нашай сабачагабарытнай кватэры я вырашала за раз мець толькі адзін экзэмпляр калекцыі. Так і буду па чарзе мець па экзэмпляру, покуль не паймею ўсю калекцыю. Ну, вядома, кожны этап зьбіраньня будзе дакумэнтальна засьведчаны і на памяць захаваны. Ну, вы ж ужо сто разоў бачылі гэты альбом. Гэта я зь вінчэстэрам у лесе пад Заслаўем. Ну, то ж побач Верка Сушчэня. А гэта я са шмайсэрам на сьвяце гораду. Насамрэчны, насамрэчны. Такі культурны малады чалавек прадаў, сантэхнік зь «Беларусьфільму». Цішкомнішком гандлюе «шмайсэрамі». Там на «Беларусьфільме» ўсё, мама, фуфло: масоўкі, мэсэршміты, партызаны, войны, коні-каровы — усё муляж. Толькі «шмайсэры» сапраўдныя. Каб адзін дзень дастаць яго з алівы, нашага ненагляднага агурайта, і тра-та-та-та-тата. Усіх гэтых таргашэй, поскудзь нялюдзкую. У кукурузны пыл. Ну, ясна шо хоч можна ў інтэрнэце купляць. Тут нядаўна пісалі, што на інтэрнэт-аўкцыёне адзін нават купіў русалку. Нейкі хакер. І што тут зьдзіўляцца? Будзе сабе трымаць у сваім доме русалку. Мама,

> Там на «Беларусьфільме» ўсё, мама, фуфло. Толькі «шмайсэры» сапраўдныя.

ну, якая праблема трымаць русалку ў кватэры? Што харч? Вам толькі б паесьці. Зусім бульба ў галаву дала на старасьці гадоў. Гэта наагул ня ёсьць праблемай. З харчам для русалкі. Можна скормліваць ёй вашы ўлюбёныя гарэлыя батоны 3-й катэгорыі. Ну, канечне, на хлебазаводзе. Або на «Камунарку» хадзіць на задні двор па пратэрмінаваныя вафлі ў чакалядзе. Плесьню ножыкам саскубаеш і тачы на здароўечка. Жыць-сьпяваць русалка будзе. Тут я прадбачу добры фінал. Ня тое як у гісторыі з дрэварубам у Японіі. Паехаў адзін у Японію лес валіць на два гады. Ну, ён з сынам, канечне, ліставаўся па інтэрнэце. І раптам сын бачыць, што бацька фігуруе ў розных позах на порнасайтах. Сыну зрабілася ніякавата неяк. З аднаго боку, быў рады высьветліць сынок, што ягоны бацька огого-го які яшчэ крэпкі. Як дуб. Але зь іншага боку. Інфармацыя і, сама галоўнае, карцінка, што той толькі з мужчынамі. Не, я супроць іх, гэтых, нічога, але ж бацька. Няёмка — сьвятое. Куды цяпер усе гэтыя ўспаміны зь дзяцінства дзяваць? Як цяпер ставіцца да навагодніх падарункаў пад ёлкай? Ну, сын пайшоў калупацца яшчэ глыбей — да-

стаў парольны доступ і заходзіць у сакрэтны інтэрнэт, выключна для членаў камчацкай чыгункі, і ў іх эксклюзіўным жывым журнале чытае, што бацьку на лесапавале выпадкова самурайскім мечам адрэзала ногі. І фотка вісіць. Ды ня ног. Усяго астатняга. О так во: татуля — нікчэмны калека. Хлопец яшчэ пакалупаўся ў інтэрнэце. Заходзіць цяпер ужо на самы-самы, самы-саменькі найсакрэтнейшы сайт, куды і зайсьці немагчыма. І бачыць: акрамя ўсяго таго прочага, ёсьць сьведкі, што бацька да таго ж прытаргоўвае «Гэрбалайфам». І тут сынок, ня ў змозе даць рады ўсім гэтым комплексам бацькі, пайшоў і выкінуўся з вакна. Зь дзясятага паверху хрушчоўскага дому. Іх на ўвесь Менск толькі дзьве такія дванаццаціпавярховыя хрушчоўкі. У 60-я для кітайскага дыпкорпусу збудавалі. Здаецца, і цяпер стаяць на Багдановіча. Тады Горкага. Максімава Максімавіча.

## 2. Сьмерць у пустой кватэры

Першая занепакоілася ягоная маці. Калі нанятыя рабочыя, маладыя хлопцы з блізкай будоўлі, ад якіх, як мёртвай вадой, тхнула віннымі парамі, выламалі дзьверы, вока маці маланкава выхапіла гэтую крыклівую пустэчу белых сьценак гасьцёўні. Скінутыя ў некалькі куп кніжкі. А ў разорах паміж імі — сіліконавая нітка як бы смаўжынай дарожкі-слізі на паркеце.

Першы будаўнік самлеў на месцы, як толькі выбілі дзьверы і ў твары тхнула нясьцерпным смуродам перагнілых рыбных адкідаў. Другі — па нейкай сэкундзе, згледзеўшы пазелянелыя голыя ступакі выпрастаных ног, што вытыркаліся з вушака спальні. Але мерцьвяком ня пахла — перабіваў смурод гнілой рыбы.

Пабіты плямамі гніеньня ў спальні ляжаў труп сына, але маці не самлела і, перабываючы ў аўтапілётнай напаўпрытомнасьці, хістаючыся, з гермэтычна-тупамерным погудам у галаве, чамусьці пайшла на кухню, адкуль і тхнула рыбіным смуродам.

На падлозе паміж лядоўняй і пральнай машынкай яна ўбачыла зялёнае, бы збуцьвелы камень, жаночае тулава. Тулава аздаблялі ахайна спарадкаваныя доўгія валасы, амаль цалкам асланяючы худыя прыгожыя рукі. Але ж незалежныя ні ад кога, заўсёды цікаўныя людзкія вочы працягвалі вандраваць усё ніжэй па мёртвым целе, і там, дзе мусіць быць працяг, ногі, нечакана напароліся на масіўны, закручаны ў колца хвост. Лускавічны хвост русалкі.

## 3. Русалчыны сьлёзы

Русалка не любіла прыймаць душ разам. У першы дзень трое грузчыкаў з інтэрнэт-крамы — чырвоныя бэйсболкі і пярэстая ўніформа — занесьлі вялізны акварыюм у кватэру. Ён даў аднаму зь іх шчодрую гасьціну. І потым, калі за імі зачыніліся дзьверы, а ён, не шкадуючы вопраткі, дастаў з акварыюму зьнізу сьлізкае, а зьверху аксамітнае цела ды панёс яе ў лазенку, каб памыць, дык русалка выпрастала далікатную шыю і па-шляхетнаму павольна закруціла галавой на знак адмовы. Гэты просты жэст зачараваў яго, і неспадзявана ён даў самому сабе дзіўнаватую клятву, што не разьлюбіць яе ніколі. А закахаўся ён усяго толькі на некалькі сэкундаў раней, калі праз шкляныя сьценкі акварыюму і цьвілую ваду ўбачыў яе ўважныя, крыху раскосыя вочы. Потым, па часе, калі яна прасілася ў душ, ды ён заносіў яе ў лазенку, і яна адно пазірала з маўклівым дакорам ды не пускала вады, покуль ён не выходзіў і не прычыняў за сабой дзьвярэй.

Больш за ўсё яго агаломшыла адкрыцьцё, што ў яе кароткая памяць. Дужа кароткая. Аднаго дня, калі, накінуўшы палітон на саколку, ён выправіўся ў горад па справах, а вярнуўся толькі надвячоркам наступнага дня, русалка яго не пазнала. Ён зайшоў у спальню, а яна, напаўседзячы на канапе, толькі зьбянтэжана лыпала вачыма. Аднак калі ён наблізіўся і паспрабаваў абняць яе, яна нязмушана, ужо без каліва разгубленасьці, злосным кулачком, удар зьнізу, заехала яму праміж ног. Адскочыўшы да сьценкі, не па-людзку сыкнула і прыняла абарончую паставу.

Яму прыйшлося знаёміць яе з сабой



РУСЛАН ВАШКЕВІЧ «VATERLINE»

наноў. Зразумелая рэч — цяпер ён ведаў ейныя павадкі, характар, і таму працэс зьбліжэньня значна скараціўся, але зь яе боку ўсё адно гэта было знаёмствам з чужаніцам, і датуль, пакуль ён зноў пачаў выклікаць у яе нейкія пачуцьці, яны досыць доўга нават спалі ў розных пакоях. І ён, круцячыся на самотнай раскладанцы, думаў, што пэўна ж, цяпер яна будзе кахаць яго менш, бо зусім ня памятае той купы прыемнасьцяў, якія ён пасьпеў зрабіць ёй да таго злашчаснага выхаду ў горад.

Сярод прыемнасьцяў было ўсякае featureлае — рознае, напрыклад, штодзённы масаж сьпіны, што доўжыўся амаль гадзіну, ажно пакуль ягоныя кволыя, якія ведалі адно ляпаньне па клявіятуры, пальцы, не пераставалі слухацца, пачынаючы выконваць загады мозга ці не з сэкундным спазьненьнем.

Ягоны дзень складаўся з выкананьня яе дробных просьбаў: прынесьці вады, запарыць гарбаты, пачухаць сьпіну, паслухаць знойдзеныя ёю ў чытанай кнізе эфэктныя цытаты. Калі яны ўжо былі ў ложку і ён цягнуўся патушыць сьвятло, яна магла папрасіць разбудзіць яе праз чвэртку гадзіны, маўляў, хоча абмысьліць сёе-тое, і ён, моцна прыспаны, прадзіраючыся праз сон, мусіў чуйнаваць, каб раскатурхаць яе праз гэтыя пятнаццаць хвілін. А яна, зусім асавелая, усё адно засынала наноў, цяпер канчаткова, на ўсю ноч, так і не выканаўшы сваіх плянаў падумаць перад сном.

Яго тачылі сумненьні, ці яна любіць яго за сукупнасьць учынкаў і асабістых якасьцяў, то бок чым ён ёсьць, або ці ж яна кахае яго толькі ў нейкі акрэсьлены момант, да прыкладу, у час, калі робіць ёй масаж, а потым становіцца непатрэбным. Да таго ж, ён спалохаўся, што ў яе наагул рыбіна памяць, якая трывае адно колькі сэкундаў, і русалка забывае яго многа разоў на дзень. Але дзіўным чынам ад тых сумненьняў і страхаў у ягоным сэрцы імпэт змагацца за яе толькі дужэў, адно мацнела жаданьне рабіць ёй яшчэ больш прыемнасьцяў, ахвяраваць сябе без астатку, залагодзіць яе да стану ўзаемнага каханьня, заслужыць яго дзеяньнем. Пры гэтым скептычны голас, які зусім ня верыў, што рабленьне прыемнасьцяў можа спрычыніцца да ўзьнікненьня каханьня, старанна заганяўся ім у самыя глухія куткі сьвядомасьці.

Цяпер ён не ўжываў алькаголю, бо баяўся праспаць яе памяць, і штораніцы, яшчэ ў ложку, зазіраў ёй у вочы, намагаючыся спраўдзіць, ці ж не забы-

# Гурковы цукар

ла яна яго. І толькі атрымаўшы ад яе знак, напоўнены для яго таемнага сэнсу зрух брыва або раптоўнае пырханьне вейкаў, супакойваўся і ішоў на кухню гатаваць каву або займацца якімі іншымі справамі, якіх менела дзень пры дні. Але датуль, пакуль такі знак не зьяўляўся, цяжэнны чыгунны каўпак чорнага нябыту гермэтычна атачаў яго і ён адно натужліва сачыў за рухамі ейнага цела, шукаючы—не знаходзячы—зноў шукаючы—і нарэшце заўважаючы прагна чаканыя прыкметы станоўчага адказу.

Начамі яму ня спалася. Ён чуў пасьцельную мітусьню з надта блізкіх вокнаў суседзяў. Чуў лопат крылаў кажаноў. З акацыі, якая расла на цеплатрасе побач з вакном, кажаны выпырхвалі, часта-густа махалі няўклюднымі крыламі і, бы прывязаныя невідочнымі гумовымі жгуцікамі, па неймавернай траекторыі хапатліва вярталіся ў гушчар, распавядаючы на ультрачастотах свае злавесныя вэрсіі стварэньня сьвету. Чуў крокі самадастатковых катоў, якія пахаджвалі па даху над яго галавой. Іх сталёвыя кіпці біліся аб бэтонныя пліты, а хвасты мялі месяцовую пыльцу. Аднак нараніцы, калі ён на колькі хвілінаў дазваляў сабе адлучыцца з кватэры, выходзіў наверх і глядзеў на тое месца, дзе ўчора ступалі каціныя лапы, ды бачыў адно запаскуджаны, пакрыты смалою дах. Ён вяртаўся назад у кватэру, а русалка, ужо чуйная, пажадліва сьцябала хвастом, зь юрлівай млявасьцю аблізваючы з лыжкі парэшткі вішнёвага ёгурту. Любошчаў ёй хацелася адно раніцой. Але больш нават за хвіліны блізасьці ён любіў рэдкія імгненьні мілоты, зыркіх, бы нядзельнае сонца шчасьця, імгненьняў, якія раз-пораз надараліся надвячоркавымі гадзінамі, калі бяз дай прычыны русалка похапкава прытуляла ягоную галаву да сваіх маленькіх грудзей, пачынала гладзіць яго па рана аблыселай макаўцы, казаць «Жэнечка», шэптам сьпяваць на мёртвых мовах песьні, цягучыя, бы карамэль. І на пэўным этапе, калі выхад у абсалют набліжаўся, то час на імгненьне правісаў, запавольваўся, татальнае шчасьце ўсё не надыходзіла, і менавіта ў гэты момант, нібы адчуўшы прыкрую затрымку, русалка мацней сьціскала свае абдоймы вакол яго шыі і гэтага хапала.

Неўзабаве паўстала праблема з інтэрнэтам. Побач будавалі дом і пашкодзілі тэлефонныя кабэлі. На вуліцу ён не выходзіў, бо баяўся, што русалка ізноў яго забудзе, але і людзей у кватэру пускаць не зьбіраўся. Для сваіх хакерскіх апэрацыяў у сеціве ён паспрабаваў карыстацца мабільнікам замест кампутара, але мабіла пастаянна завісала і рады не давала.

Ён вырашыў прадаць мэблю. Патэлефанаваў і даслаў прыватную абвестку ў газэту. Потым вываліў на падлогу нікому не патрэбныя ў наш час кнігі. Абыяк нагамі сьпіхнуў іх у купы. Падчас пазбаўленьня кніжнай шафы гонару, як і раней, калі яна станавілася сьведкам дзеяньняў, зьвязаных з руйнаваньнем і дэструктурызацыяй, русалка ажывілася, узьнялася вэртыкальна на свой хвост, не раўнуючы кобра, а ў вачох шуганула лютае полымя. Яна стала круціць рукамі, хітаць галавой, і гэта

Ганс Хрысьціян Андэрсэн — сабачы выціран».

нагадвала жаночыя танцы, ці то арабскія, ці то індыйскія.

Пакупнікі прыехалі ў той самы дзень: да пад'езду, куды ён з натугай сьцягнуў па сходах шафу, прыйшлі двое, муж і жонка, а ён, не таргуючыся і ня гледзячы ў вочы, аддаў яе за дзясятую частку ад рэчаіснага кошту.

Мэбля і іншыя прычындалы патроху распрадаваліся: людзі тэлефанавалі, дамаўляліся аб часе візыту, прыходзілі да пад'езду, зьдзіўляліся незвычайным умовам угоды, пачыналі падазраваць яго ў махлярстве, нядобра азіраліся, але атрымаўшы сапраўды нізкую цану, жвава грузілі набытае на легкавушкі і зьязджалі праз арку.

Лэп-топ ён збыў апошнім. Калі пакупнік, які дамовіўся зь ім пра сустрэчу, заехаў на машыне ў двор, выявілася, што гэта ягоны былы аднакурсьнік, таксама хакер. Аднакурсьнік з заплюшчанымі вачыма безупынку балбатаў, распавядаючы пра новыя вэрсіі праграм, пра агульных сяброў, а яму ўсё чулася, што аднакурсьнік напрошваецца ў госьці. Аднакурсьнік нарэшце зьехаў, а ён зайшоў у пад'езд і доўга-доўга стаяў у цемры, нахіліўшыся, прытулены ілбом да сьцяны, паклаўшы раскрытыя далоні на халодныя батарэі, ахінуты дзікім жахоцьцем, што вось толькі што гэты чалавек стаяў на якіх некалькі дзясяткаў, некалькі дзясяткаў сабачых мэтраў ад ягонай кватэры, і пара неасьцярожных згодаў — дый чалавек мог прабрацца ў кватэру, зайсьці ў пакой і ўбачыць яе.

Адной ночы, за колькі тыдняў да сьмерці, ён прахапіўся са сну. Махры дажджавых кропляў аздаблялі верх аконнага праёму. Толькі праз імгненьні, пра якія ён падумаў: дзіўна, няўжо так насамрэч позьніцца гук, — пачуў няўрымсьліва тупамерны пошчак дажджу. Нязграбна варушачы рукамі, па-яшчарынаму зьвіваючыся, намагаючыся не патрывожыць русалку, ён вылузнуў з-пад коўдры, асьцярожна споўз, як адфаксаваны аркуш, з канапы на падлогу нагамі ўперад. Узьняўшыся, заплюшчыў вочы — каб убачыць хоць што ў гэтакай эгіпецкай цемры — і расплюшчыў зноў; потым пасунуўся ў кірунку дзьвярэй. Запаліў і тут жа — як і не было ў паміне — маланкава патушыў сьвятло ў вітальні. За гэтае кароткае імгненьне здолеў згледзець на старой тумбачцы асадку. Замкнуўся ў прыбіральні, адарваў жмут ад рулёну і асьцярожна, каб не парушыць далікатнай крохкасьці туалетнай паперы, стаў адольваць літару за літарай. Напісаўшы, укінуў паперку ў зеўра ўнітазу і адразу тузануў за клямку зьліўні. Падумаў, які бессэнсоўны ўчынак, дурота. Аднак ведаў, што не напісаць ня можа.

Чытайце:

«Казкі пра русалак — суцэльная выдумка.

Русалчыны сьлёзы — гэта калі плачаш ты, а не русалка.

Калі русалцы добра, табе пагана.

Калі русалцы пагана, табе і пятля — збаўленьне.

Русалцы пагана заўсёды.

Ня тое што яна русалка і ёй пагана, гэта пагана яна сама і ёсьць.

Знаёмства з русалкай вядзе ў магілу.

Калі ты перастрэў жанчыну (ці нават убачыў яе на вуліцы, увобмільг)

і разумееш зьнянацку, што яна русалка, — ведай, што

знаёмства зь ёй табе ўжо не пазьбегнуць.

Ганс Хрысьціян Андэрсэн — сабачы выціран».

Усё мусіла скончыцца празь лічаныя дні. Ён ведаў гэта і не баяўся. Пад шэрым, правіслым небам адзін на адзін лезьлі дахі з ускудлачанымі антэнінамі.

# Смачна есьці

жарты

У апошнія гады мода на экалягічна чыстае харчаваньне абляцела ўвесь сьвет.

«Бліжэй да прыроды трэба быць!» — сьцьвярджаюць публікацыі ў часопісах, выступы на радыё. Ня хочучы адступаць ад сучасных тэндэнцыяў, дасылаю некалькі рэцэптаў танных страваў з прыроднага матэрыялу, здольных максымальна наблізіць вас да сьвету жывой і нежывой прыроды.

**Блінцы з камбікорму**

Вам спатрэбіцца 300 г камбікорму, 2 шклянкі вады пасьля мыцьця тлустага посуду, 1 яйка, 1 цыбуліна, 100 г пазалеташняй перапрэлай капусты. Соль і цукар — нельга! Белая сьмерць!

*Спосаб прыгатаваньня:*

Запарыць камбікорм у вадзе. Убіць яйка. Дадаць капусты. Смажыць да гатоўнасьці. Можна цыбулі ўкрышыць, каб капуста не сьмярдзела. А ня ўкрышыце, дык і так зьясьцё — чорт вас ня возьме!

**Кальмары па-сьвінячы**

Вам спатрэбіцца кошык гарбузьніку, паўлітры неачышчанага рыбінага тлушчу, прызначанага для падкормкі сьвіней.

*Спосаб прыгатаваньня:*

Пакрышыце гарбузьнік. Паліце рыбіным тлушчам. Брыдота? Бачылі вочы, што рукі рабілі? Дык цяпер ежце, хоць павылазьце.

**Грыбкі «Ў апошні шлях»**

Вам спатрэбяцца 0,5 кг любых грыбоў, 400 г адвару лістоў фікуса альбо воўчых ягадаў.

*Спосаб прыгатаваньня:*

Грыбы засмажце. Дадайце адвару. Перамяшайце. Паскудзтва? Атрута? Памерці баіцеся? А што ж вы думалі: на тым сьвеце сэрвэлятам кормяць?

**Тацяна Барысік**

# Выбраны народ

фэльетон

Ад пачатку вякоў існаваў народ, якога выбраў Бог. Але заўсёды існавалі народы, якія выбіралі сабе багоў і якім з натхненьнем пакланяліся і служылі, прыносячы крывавыя ахвяры. Але найбольшаю ахвяраю для такіх багоў заўсёды была ахвяра духу. Без унутранай велічы чалавек становіцца нявольнікам, нават не разумеючы аб гэтым, бо губляе ўнутранае вымярэньне дабра і зла, значэньне волі і няволі. Яго жыцьцёвыя і сацыяльныя арыентацыі будуюцца на запаветах, якія даюцца багамі.

Наступае момант, калі новыя багі абвяшчаюць аб тым, што яны выбралі той ці іншы народ, каб служыць гэтаму народу, і народ будзе жыць шчасьліва, пакуль служыць свайму богу. Так будуецца вера і так ствараецца няволя. Усё тое, што не адпавядае запаветам, мусіць зьніштажацца, а незадаволеныя — пабівацца камянямі.

Падобны лёс не абмінуў і беларусаў. Прыйшоў той, хто выбраў гэты народ, і народ павінен слухаць і служыць яму, бо толькі праз гэта людзі будуць шчасьлівыя.

Яны называюць яго ППрэзыдэнт і шэптам кажуць яго імя. А ён, ППрэзыдэнт, даў ім табліцу запаветаў, каб ведаў народ, што рабіць і куды ісьці.

1. ППрэзыдэнт Лукашэнка — твой адзіны ППрэзыдэнт, не выбірай іншых ППрэзыдэнтаў, акрамя яго.
2. Не сумнявайся ў тым, што ён робіць, слухай яго і давярай яму ва ўсім.
3. Не прамаўляй слова «апазыцыя» і імёнаў ейных лідэраў.
4. Не займайся палітыкай.
5. Галасуй заўсёды «ЗА».
6. Ня думай.
7. Ня май свайго асабістага меркаваньня.
8. Не аглядай нічога, акрамя БТ, АНТ, і не чытай нічога, апроч «Советской Белоруссии».
9. У чарцы і скварцы шчасьце тваё, большага ніколі не жадай.
10. Усяго бойся і не супраціўляйся.

І будзе народ блукаць у цемры, упэўнены, што жыве ў сьвятле. І будуць казаць і слухаць хлусьню, веруючы, што гэта праўда. І прыйдзе новы ППрэзыдэнт, і яны верна будуць служыць яму.

**Павал Вусаў**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Вачыма дазымэтрысткі

**Віктар Корзун: Адны ня хочуць ведаць, другія думаюць, што ўсё ведаюць, а праўды ня ведае ніхто. Аўтар фільму «Васіль Быкаў. Вяртаньне» зьняў другую сваю стужку, пра Чарнобыль.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Віктар Корзун**

нарадзіўся ў 1966 у Менску. Рэжысэр. Скончыў мастацкую вучэльню імя Глебава (1986), Акадэмію мастацтва (1995). Аўтар фільму «Васіль Быкаў. Вяртаньне» (2004).

**«Наша Ніва»: Як узьнікла ідэя здымаць фільм менавіта пра Чарнобыль?**

**Віктар Корзун:** Калі ёсьць магчымасьць нешта зрабіць, то найлепш рабіць гэта на сур'ёзную тэму. Пра Чарнобыль пачынаюць забываць. Народ спакойна ставіцца да трагедыі. Ёсьць асобныя публікацыі перад 26 красавіка, але гэтага мала. Я перад пачаткам працы над фільмам кансультаваўся з экспэртамі ў чарнобыльскай трагедыі, у тым ліку і зь Юр'ем Бандажэўскім. Я імкнуўся паказаць як мага больш аб'ектыўную карціну Чарнобылю.




## «Там не пяюць птушкі»

**«НН»: Хто ў фільме героі?**

**ВК:** Гэта прафэсар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Іван Нікітчанка і звычайная дазымэтрыстка з Брагіншчыны Настасься Пятроўна, ліквідатарка Чарнобыльскай катастрофы. Яна адна зь нямногіх, якія засталіся тамака кантраляваць сытуацыю з радыяцыяй. Не хачу называць яе прозьвішча, каб у яе не было праблем, бо яна вельмі даверліва паставілася да нас. У кожным заражаным раёне ёсьць пункт кантролю за радыяцыяй. На адным зь іх яна й працуе.

Цікава выйшла: мы толькі прыехалі да яе і адначасова да яе прыехалі людзі зь Менску, якія назьбіралі грыбоў і хацелі праверыць іх на радыяцыю. Яна кажа, што доза радыяцыі ў грыбах перавышаная. І што вы думаеце: назаўтра мы сустракаем гэтую сям'ю, якая нас запрашае да сябе дадому паесьці грыбоў...

А і сама Настасься Пятроўна — тыповая жыхарка тых мясьцінаў. Яна кажа, што радыяцыя ня пахне, яе рукамі не памацаеш, дык чаго яе баяцца. Яна кажа, што нічога не здараецца, а пасьля расказвае, што на мінулым тыдні памёр адзін яе аднагодак, за ім адразу другі. Нейкі ейны сваяк памёр ад раку. Гераіня вельмі добра сябе пачувае, ходзіць паўсюль, замярае радыяцыю. Яна не баіцца, кажа: я ж рукі мыла. Гэтая жанчына кажа, што перасяляць людзей ня варта, бо гэта бессэнсоўна...

**«НН»: А што кажа Нікітчанка?**

**ВК:** Нікітчанка падыходзіць з пазыцыі навукоўца, кажа, што Чарнобыль ударыў ня толькі па Беларусі, але і па ўсім сьвеце. Я, як рэжысэр, хачу, каб чалавек сам усё супаставіў і прыходзіў да нейкіх высноваў, каб нараджалася трэцяя ісьціна. Ні Нікітчанкава, ні гэтай дазымэтрысткі, а нешта трэцяе. Праз гэта фільм і завецца «Верыць толькі ветру». Не хачу ствараць танных эмоцыяў...

## «Наўрад ці фільм пакажуць па БТ»

**«НН»: А што запомнілася найбольш за час перабываньня ў забруджаных раёнах?**

**ВК:** Розныя незвычайныя рэчы. Аказваецца, што кукуруза абсалютна не набірае радыяцыі, хоць яе пасадзі на самім чарнобыльскім рэактары... Што тамака расьце чорная бяроза. Поўна розных зьвяроў, пачалі запускаць зуброў. У лясах чарнобыльскіх раёнаў не пяюць птушкі...

**«НН»: Як Вы думаеце, ці можа фільм быць паказаны на БТ?**

**ВК:** Магчыма, адбудуцца закрытыя паказы ў некаторых кінатэатрах перад 26 красавіка. На БТ — наўрад ці, бо ў фільме — праўда. Героі фільму гавораць па-рознаму, але ўсе гавораць праўду, а гэта — самае страшнае для нашага тэлебачаньня.

**Гутарыў**
**Зьміцер Панкавец**

### Прафэсар Юры Бандажэўскі на сайце nn.by

У панядзелак 23 красавіка дасьледчык наступстваў Чарнобыльскай катастрофы Юры Бандажэўскі у рэжыме рэальнага часу адкажа на пытаньні чытачоў сайту www.nn.by. Пытаньні яму можна задаваць ужо зараз на сайце. Праф.Бандажэўскі ў 1999—2005 сядзеў у турме. Пасьля вызваленьня ня мог знайсьці працы ў Беларусі, цяпер займаецца навуковымі дасьледаваньнямі ў Клермон–Фэране (Францыя).

## Магілёўцы чытаюць на ТВ Купалу й Коласа

Унікальную акцыю да юбілею клясыкаў зладзіла гарадзкая філія ТБМ сумесна з каналам «Магілёў-2». Да 7 ліпеня на ТВ будуць гучаць творы Купалы, пасьля — Коласа, які нарадзіўся 3 лістапада. Вершы чытаюць людзі розных гадоў ды сацыяльнага становішча. Першымі адгукнуліся выкладчыкі й студэнты ўнівэрсытэту, акторы. Суполка ўкраінцаў узялася рыхтаваць чытаньні на мове Шаўчэнкі. А ірляндцы — па-ангельску.

Штодня ў эфір ідзе каля сямі 30-сэкундавых ролікаў.

## Радзімічы пабілі крывічоў

14 красавіка стартаваў 17-ты чэмпіянат Беларусі па футболе. Першы тур адкрываў матч у Гомелі паміж мясцовым клюбам і наваполацкім «Нафтанам». «Гомель» перамог зь лікам 3:1.

## Бралі сем мільёнаў

14 красавіка ў судзе Цэнтральнага раёну Менску агучаны прысуд у справе аб самым буйным хабары ў гісторыі краіны. Пяць чалавек пойдуць у турмы на тэрмін ад шасьці да дзевяці з паловай гадоў. Вінаватымі прызнаны Алег Жукоўскі, Аляксандар Пашук, Юры Міхайлоўскі, Мікалай Пенкрат і Віктар Бароўнік. Яны вымагалі ў дырэктара адной з бударганізацый 7 млн. даляраў за вырашэньне пытаньня аб забудове 20 гектараў пад Копішчам (Менскі раён). Злачынцаў затрымалі пры перадачы першай часткі сумы, 1,5 млн.

## Чароўныя зьмеі Аляксея Ненадаўца

Выйшла ў сьвет новая кніга фальклярыста з Бабруйску Аляксея Ненадаўца. У зборнік «Чароўныя зьмеі» сабраныя легенды й былі пра гадаў.

## З бліжнім сьвятлом круглы год

Ад 16 красавіка кіроўцы ў Польшчы цягам усяго году мусяць езьдзіць выключна з запаленымі фарамі. Бліжняе сьвятло круглы год мусіць быць запалена на аўтамабілі падчас руху таксама ў Чэхіі, Швэцыі, Італіі, Эстоніі, Латвіі, Фінляндыі. Дык там нават аўтамабілі цяпер прадаюцца з опцыяй аўтаматычнага ўключэньня фараў пры павароце ключа запальваньня.

**МБ**

## Гіганцкі сад на радзіме Лукашэнкі

На палях паміж вёскамі Александрыя і Мяжнік Шклоўскага раёну закладаецца яблыневы сад. Маштаб грандыёзны: плошча 163 га, больш за 270 тыс. дрэваў. Звыш за 50 тыс. польскіх сажанцаў ужо растуць. У Александрыі, дзе жыве 400 чалавек, збудавалі шыкоўны басэйн. А як у вёсцы жыве ўсяго 400 чалавек і Дняпро цячэ, то плаваць асабліва няма каму. То мо хоць яблыкі будзем мыць, жартуюць вяскоўцы.

**Паводле радыё «Рацыя»**

## Як стаць мільянэрам

Транспартнай пракуратурай узбуджана крымінальная справа у адносінах да начальніка зьмены грузавога комплексу аэрапорту «Менск». Быццам бы шляхам падробкі папераў ён вывез са складу футра норкі на 2,5 млн даляраў.

**Паводле «Звязды»**

**У Пінск прыйшла вясна.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## СЯРЖУК СЫС

***

Дзяўчына, якая так шчыра з табою гуляе
Зрэдку ў размовы
і значна часьцей у маўчанку,
І ежу гатуе, і чэша грабеньчыкам косы якая,
А болей за сэкс марыць выспацца ранкам.

Сьляпую, якую вядуць у кавярню, каб потым
Абавязкова абрынуць на дол,
ці на стол, ці на ложак,
Якая так шчодра за гэта падзеліцца потам
І фантастычнымі ўздрыгамі вуснаў,
а можа і ножак.

Якую ты да і пазьней, а яшчэ на сьвітаньні
Так ненавідзіш, што чуеш,
як крышацца зубы,
За тое, што дорыць яна
бессаромна каханьне,
Дарэчы, якое таксама звычайная згуба.

Якая аднойчы зарэжа цябе нечакана
Банальным іржавым нажом,
безь ніякай нагоды,
Якая сама — не жыцьцё, а крывавая рана,
Глыбокая плынь, дзе сядаюць на мель параходы.

Што больш за кадэтаў загады твае паважае
Без аніякай надзеі ім павінавацца,
Якая жыве недзе там, паміж пеклам і раем,
Ці, болей дакладна,
паміж не тваіх мастурбацый.

Якой невядомы экстаз ад фатэльнай самоты
І розьніца ў слове распуста
і ў слове нявіннасьць,
Якая і брэндзі, і півам напоўніць употай
Венаў аб'ём, захаваны для марачных вінаў.

Зацята якая шукае ў мужчынскіх кішэнях
Сьведкаў твайго верагоднага кроку налева,
Якая на вершы плявала ды на летуценьні
І непрытомнела ўраз ад няхітрых напеваў.

Якой аніколі ніхто не даўмеўся тлумачыць,
Што ціхая здрада
ня можа быць зьявай прыстойнай
І асабліва тады, калі ты не мужчына, а мачо,
Здатны на самыя крывапралітныя войны.

Дзяўчына, якая народзіць
дзіцятка, падобнае Богу,
І ён будзе ты, а сама —
а сама застанецца дзяўчынай —
Дзяўчына, ня ведай ніколі, што кажа паэта нябогі:
Цябе не кахаць і ня жыць —
як і жыць і кахаць — немагчыма.

## АРЦЮХ ГЕРМАНОВІЧ

ВЯСНА

сны
ня
той
вясны
сок
сакавіка
сьнег
ці
то
вада
цішыня
нуда
горы
сьмецьця
горад
крыкі
цягніка
ключ
твая
рука
не
твайго
замка
сэрца
не
сьмяецца
мары
пра
вясну
думкі
не
да
сну
пэўна
не
засну



**Насупраць Нацыянальнай бібліятэкі 16 красавіка.**

# Неба BLAкітнае




**Голая манашка + S.D.M.(demo), БМА–груп, 2007.**

«50 год беларускаму радыё, якое 50 год нікому не патрэбнае».

«Манашка» падавала надзеі на пачатку сваёй кар'еры, пры канцы 90-х. Тады думалася, што праз год-другі яны ўвойдуць у лік лідэраў беларускага року. Пры такой сцэнічнай і жыццёвай харызьме, выдатным адчуваньні музыкі і рок-паэзіі гэта было цалкам магчыма. Неадэкватнасьць лідэра гурту Федзі толькі дапамагла б. Але «Голая манашка» мае дагэтуль нерэалізаваны патэнцыял, некаторыя праблемы з законам ды вузка лякальную папулярнасьць. І яшчэ вось гэты дыск зь ніякім дызайнам, але афіцыйна выдадзены. ГМ — гурт, у творчасьці якога няма прахадных песень. Запісаныя яны не найлепшым чынам, але ад таго вастрэй адчуваецца дух таго самага сумленнага року: калі песьня ірвецца з душы параненай птушкай. І тут няважна: мацюкамі выказаныя эмоцыі ці словамі Новіка-Пеюна, з дапамогай некалькіх музыкаў ці проста на акустычнай гітары. Калі нешта і вылучаць з альбому — дык гэта найперш «Радыёактыўны фон» (пра Чарнобыль з душою) і «Наркатычны транс» са словамі «50 год беларускаму радыё, якое 50 год нікому не патрэбнае». На дыску ёсьць яшчэ смачны дадатак — дэма-альбом ляўрэатаў апошняга «Басовішча» і «Рок-Кола» гурту S.D.M. Для цікаўных — прыдасца. Такія песьні, як «Чужы» і «Ніколі», даюць спадзеў, што S.D.M. здольныя дарасьці (а мо і перарасьці) да сваіх куміраў з N.R.M. Галоўнае, каб ня здарылася таго самага, што з «Голай манашкай».

Дыск для тых, хто бяз боязі гатовы пагрузіцца ў поўны андэргранд.

# Drive




**Алег Сьпіцын і Чэрмэн, НМК, 2007.**

Можа пасаваць як саўндтрэк да кампутарных гульняў.

Новы дыск ад майстроў гітарнага інструмэнталу, на якіх ужо прызабыліся. Прэтэнзіі ў гэтых музыкаў немалыя, у адрозьненьне ад іншых беларускіх гітарыстаў-віртуозаў. Сьпіцын і Чэрмэн першыя ў Беларусі паспрабавалі вывесьці свой кірунак са сфэры нікому не патрэбных экспэрымэнтаў у камэрцыйнае рэчышча. Сёй-той посьпех яны здабылі, пайграўшы на разагрэве замежных рок-зорак на іх менскіх выступах, зьняўшы відэа ды выдаўшы во гэты дыск. За часоў іхнае маладосьці мэталісты знаходзіліся ня ў надта добрых стасунках з нэараманты-камі. Магчыма, гэта падштурхнула Сьпіцына з Чэрмэнам злучыць у адно гэтыя два пачаткі. У «Драйве» ня надта мудрагелістая гітарная музыка замяшаная з электроннымі інструмэнтамі — у выніку ствараецца атмасфэра прысутнасьці ў нейкай віртуальнай прасторы. Відавочна, што тут даўся ў знакі ня толькі Стыў Вэй, але і Жан-Мішэль Жар. Музыкі не намагаюцца апярэдзіць час — яны проста паказваюць, як яны думаюць і што яны ўмеюць. Можа, ад таго, слухаючы іхныя творы, складваецца ўражаньне, што недзе гэта ты ўжо чуў. Асабліва тое адчувальна ў байкерскіх рытмах «Speed retrace» і балядзе «Сга». У альбоме ёсьць песьні, зробленыя з аглядкай на «Emerson, Like&Palmer», але ёсьць і абсалютна правальныя нумары, як твор «Air». Альбом Сьпіцына і Чэрмэна цалкам прыдасца для рэляксацыі, будзе незамяняльным для тэле- і радыёрэжысэраў, а таксама можа пасаваць як саўндтрэк да кампутарных гульняў.

# Любить тебя, родная




**Аляксандар Саладуха, Vigma, 2007.**

Саладуха падае сябе такім чынам, што абывацелю цяжка не скарыцца, як і ў выпадку з агрэсіўнай рэклямай «Супэрлято».

Шосты дыск сьпевака, прымеркаваны да дваццацігодзьдзя кар'еры. Зьбяднелыя на ўяўны «фармат», айчынныя «эфэмкі» ўжо разабралі на ратацыі ўсе 16 трэкаў альбому. Песьні для Саладухі пішуць самыя топавыя беларускія паэты-песеньнікі ды кампазытары: Макс Алейнікаў, Алег Ялісеенкаў ды былы гітарыст «Новага неба» Лявон Шырын. Апошні яшчэ і прадмову да дыску напісаў, у якой раіць уважліва прыслухацца да «тонкіх струнаў чалавечых эмоцыяў». Сакрэт доўгажыхарства і адноснага посьпеху Саладухі на беларускай поп-сцэне — даволі просты. Не вядзецца пра талент, выканаўца бярэ нахабнай харызмай. Ён падае сябе так, што абывацелю цяжка не скарыцца, як і ў выпадку з агрэсіўнай рэклямай «Супэрлято». Сьпявае банальныя тэксты, але робіць гэта бескампрамісна і ўпэўнена. Таму, каго зачапіў ягоны рафінаваны патасны голас, — не ўратавацца болей ад пранізьлівых вачэй артыста. Хто адчуў у часам няблага аранжыраваных песьнях фальш і жаданьне пеюна адно быць навідавоку — адназначна будзе затыкаць вушы і заплюшчваць вочы пры адной толькі згадцы пра яго. Сярод абсалютна новых песень, заточаных пад узорную расейскую папсу, ёсьць і знакамітая «Чужая милая» ў новай аранжыроўцы, якая калісь увяла Саладуху ў шэраг самых бліскучых поп-зорак. З тых часоў у ягоным рэпэртуары так і не зьявілася такога яскравага гіта. «Мы вернёмся, обязательно вернёмся», — пяе выканаўца ў апошняй песьні. І падаецца, што супакойвае гэтымі словамі ён найперш самога сябе... Для тых, хто хоча пачувацца маладым, не прыкладаючы да гэтага аніякіх высілкаў.

**Сяргей Будкін**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Этнафэст на Возеры**

**21 красавіка (субота) а 18-й у кавярні Палацу дзяцей і моладзі** (Старавіленскі тракт, 41) адбудзецца этнафэст з удзелам гуртоў «Нагуаль», «Джамбібум», «Рэха». Праезд трамваямі № 3, 4, 5, 10 да прыпынку «Палац моладзі». Даведкі па т.: (029)272–02–90.

# Перакачаўнік

Пра татарскае смакоцьце піша **Алесь Белы.**



Упершыню я даведаўся пра таямнічы «перака́чаўнік» два гады таму, ад Ібрагіма Канапацкага. Мы абмяркоўвалі артыкул пра татарскую кухню для меркаванай энцыкляпэдыі «Наша ежа», якую пачалі былі распрацоўваць у выдавецтве «Беларуская энцыкляпэдыя». Вельмі сымпатычны артыкул пра экзатычную кухню беларуска-літоўскіх татараў напісала ў выніку дачка Ібрагіма, Зарына, але праект энцыкляпэдыі забуксаваў. Абачлівае Міністэрства інфармацыі не палічыла праект кадыфікацыі нацыянальных кулінарных традыцый годным дзяржаўнага фінансаваньня.

За гэты час мне давялося двойчы пабываць у Крушынянах на Падляшшы — сталіцы польскіх татараў і цэнтры «культу перакачаўніка», а Ібрагім Канапацкі пасьпеў пакінуць нас назаўжды. А вось сам прадукт быў унесены — самым першым! — у польскі рэестар традыцыйных прадуктаў, які Міністэрства сельскай гаспадаркі пачало весьці ў адпаведнасьці з агульнаэўрапейскімі стандартамі.

Гэтае заканадаўства, ініцыяванае французамі, мае на мэце зьменшыць валавую колькасьць і павысіць якасьць прадуктаў харчаваньня, якія выпрабляюцца ў Эўропе. Яно сыходзіць з ідэі, што адукаваны спажывец набывае ня «ежу ўвогуле», ня пэўную колькасьць калёрый, бялкоў, вугляводаў, тлушчаў, вітамінаў, не канструктар з генэтычна мадыфікаванай соі, крухмалу, гідрагенізаваных расьлінных тлушчаў і набору «ідэнтычных натуральным» *Е-згрыма-лічбамі*, а прадукт зь непаўторнымі рэцэптурай, гісторыяй, прафэсійнымі сакрэтамі, за якімі стаяць многія пакаленьні рэальных жывых людзей, годная спадчына сем'яў, прадпрыемстваў і рэгіёнаў.

Рэеструючы перакачаўнік, суседзі нават прызналі беларускае паходжаньне слова. Але што ж такое перакачаўнік?

Жывучы ў іншаверным і іншакультурным атачэньні, беларуска-літоўскія татары ў значнай ступені перайшлі на агульнае з новай радзімай мэню, а традыцыйныя стравы гатавалі па пятніцах і на сьвяты *(байрам)*. Сярод сьвяточных далікатэсаў, як і ў іншых цюркскіх народаў, было шмат страваў з мукі з рознымі начынкамі: мяснымі, малочнымі або фруктовымі, вараных, смажаных або печаных, накшталт калдуноў, беляшоў, чабурэкаў, кібінаў і інш.

Перакачаўнік належыць да гэтай шырокай групы страў. Гэта пірог зь вялікай колькасьці пластоў тонка раскачанага «макаронавага» цеста без дражджэй. Кожны пласт змазваюць маслам і закрасамі; а між імі кладуць разнастайную начынку: зь сечанага мяса (ялавічыны, бараніны або гусяціны) з дадаткам вялікай колькасьці цыбулі і сырога тлушчу; з тварагу, часам з разынкамі; з сыру; зь цёртых яблыкаў або сьліў (інавацыя апошніх часоў) і г.д. Начыненае цеста закручваюць у сьпіральны рулет, падобны чымсьці на рагалік, зьлепліваюць краі, шчодра паліваюць топленым маслам і запякаюць, або, дакладней, смажаць, «у фрытуры» — у круглым рондлі (калісь даўней — у медным), каля дзьвюх гадзін. (Калі турысты ня будуць глядзець, відаць, і фрытурніца прыдасца.) Сакрэт перакачаўніка хаваецца ва ўменьні як мага танчэй раскачаць цеста. Чым больш далікатнымі атрымаюцца бліны і чым драбней пасечанае мяса, тым смачнейшым будзе гэты старадаўні беларуска-татарскі пірог. Гатовы прадукт, паводле зарэгістраванага польскага стандарту, мае каля 30 см у дыямэтры і важыць каля 3 кг. Перакачаўнік выпрабляюць зь вельмі крутога, г.зв. макароннага цеста, з найменшай колькасьцю вады (каля 25—35% ад агульнай вагі цеста ці ўдвая менш, чым здольная зьвязаць пшанічная мука), таму яго даводзіцца вельмі доўга і старанна замешваць, пакрысе даліваючы ваду. Падавалі перакачаўнік гарачым, калі на сьвята, але і халодным, калі елі яго як закуску паміж асноўнымі прыёмамі ежы.

У радзіне Джэнэты Багдановіч, якая ўтрымлівае ў Крушынянах традыцыйную карчму «Tatarska Jurta», як сьцьвярджаюць, рэцэпт перакачаўніка перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне, сама меней з XVIII ст. (А Джэнета ўжо «раскручвае» наступныя спэцыялітэты, таксама зь беларускімі назвамі — *цыбульнікі, перамячы*...)

Падобная страва вядомая і іншым цюркскім народам, у

**Перакачаўнік**

(Рэцэпт прыблізны, больш дакладныя інструкцыі хаваюцца як сакрэт радзінай Багдановіч і іншымі татарскімі сем'ямі).

**Цеста:**

*1 кг мукі, 250 г масла, 1 шклянка сьмятаны, 3—4 яйкі, 2 лыжачкі соды, соль, цукар — па драбочку, у залежнасьці ад фаршу.*

**Фарш мясны:**

*1 кг ялавічнага ці бараняга фаршу, 4 цыбуліны дробна пакрышаныя, соль, перац, меленая папрыка — паводле смаку.*

**Фарш салодкі:**

*1 кг яблыкаў, ачышчаных і пацёртых, або 1 кг тлустага тварагу, жменя разынак, намочаных у кіпені і прамытых, 2 лыжкі цукру, сок з ½ лімона.*

**Алей для смажаньня ў фрытуры**

З мукі, паловы масла, сьмятаны, яек, соды і цукру (для салодкай начынкі; але солі і перцу — у выпадку мясной начынкі) старанна замяшаць вельмі крутое цеста, даліваючы пакрысе ваду па меры патрэбы. Падзяліць цеста на 4 часткі, кожную раскачаць у як мага больш тонкія пласты. Зьмяшаць кампанэнты фаршу паміж сабой. Нашмараваць асобныя бліны маслам, выкласьці фарш, зьверху пакласьці наступны блін і г.д. Скруціць у рулет, які затым зьвіваецца ў сьпіраль накшталт «сьлімака», зьляпіць краі. Смажыць у рондлі ў вялікай колькасьці алею (які мусіць цалкам пакрываць перакачаўнік), мясны — каля дзьвюх гадзін, салодкі — крыху меней.

тым ліку крымскім татарам, пад назвай *burma*, што азначае «закручаны ў выглядзе сьпіралі». Але нашыя татары, перайшоўшы на беларускую мову ўжо больш за 500 гадоў таму, мусілі знайсьці для гэтай назвы беларускі адпаведнік, які захаваўся ва ўсіх традыцыйных іх грамадах і за межамі сучаснай Беларусі, у Літве і Польшчы, таксама. У самой Беларусі гэтую страву таксама працягваюць гатаваць у татарскіх сем'ях, але гэта толькі іхная асабістая справа, такога ўзроўню афіцыйнай падтрымкі, як у Польшчы або як у Літве караімскі кібін, у нас ня могуць атрымаць нават куды больш вядомыя ўласна беларускія стравы. У польскіх жа мэдыях апошнія пару гадоў назіраецца своеасаблівая мода на перакачаўнік, пішуць пра яго ўсе асноўныя кулінарныя выданьні.

Чарговы халодны душ на галовы нашых «рамантычных імпэрыялістаў»: калі б пэрыфэрыйныя «этнаграфічна-беларускія» тэрыторыі, асабліва Падляшша і Віленшчына, увайшлі ў склад БССР-РБ, што б увогуле засталося ад іх (і нашых) дарасейскіх і дасавецкіх традыцый? Маем там цяпер кавалкі страчанай мазаікі, зь якіх можна спрабаваць аднавіць цэлае.

Польскія ўлады афіцыйна прызналі і заахвоцілі існаваньне перакачаўніка, беларускае паходжаньне яго назвы, нават націск афіцыйна робяць на трэцім складзе з канца (pierekáczewnik), што польскай мове не ўласьціва. Палякі ўвогуле маюць сваё слова для абазначэньня падобных страў — przekiadaniec, — але аддалі перавагу аўтэнтычнай беларускай назьве. Паспрабуем здагадацца, калі яна ўвойдзе ў слоўнікі беларускай мовы? Ці па нейкім часе цікаўныя турысты здолеюць пакаштаваць івейскі або сьмілавіцкі перакачаўнік? А пакуль будзем сачыць, як сьледам за беларуска-татарскім пірагом палякі або літоўцы будуць рэгістраваць цыбульнікі, перамячы, бульбяную кішку, бабку, тышкевічаўскія калдуны ды іншыя традыцыйныя стравы ВКЛ. Занятыя ўтрыманьнем танных цэн на сыравіну з Усходу і спрэчкамі з расейцамі за савецкія назвы цукерак ды гарэлак, да падобнага *панскага бздурства* мы дойдзем ня хутка.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Як я пераходжу на беларускую мову

**Я хачу расказаць вам аб тым, як я пераходжу на беларускую мову.**

Пачну спачатку. Колькі гадоў таму, калі я навучаўся ў школе, на ўроку фізікі неяк зайшла размова паміж настаўніцай і вучнямі пра беларускую мову. Яна казала, што родная мова для нас — расейская. Мяне гэта вельмі зачапіла, і мы пачалі спрачацца. Тады яна мне кажа: «Вось ты кажаш, што твая родная мова беларуская, але ж размаўляеш ты па-расейску, а перад тым каб сказаць што-небудзь па-беларуску, ты спачатку падумаеш па-расейску, а потым перакладзеш. На якой мове ты думаеш, тая і родная».

Я працягваў спрачацца, але і сапраўды, я заўсёды думаў па-расейску, а потым перакладаў на беларускую мову. І тут я вырашыў пачаць думаць па-беларуску. Гэта выглядала так: пасьля заняткаў, ідучы дадому, я казаў сам сабе (вядома ж, па-беларуску): вось прыйду, трэ будзе прыбрацца ў кватэры, зрабіць урокі, спаткацца зь сябрам г.д. Спачатку было неяк нязвычна. Гэта быў першы крок да маёй мэты.

Прайшоў час, і я пачаў у сваю гаворку ўстаўляць беларускія словы (дзякуй, калі ласка, прабачце і г.д.). Неяк едучы ў аўтобусе, я сядзеў ля акна, і на прыпынку зайшла жанчына. Я ёй прапанаваў сесьці (па-беларуску) і саступіў месца. Яна села і сказала: «Спасибо». Але ёй, напэўна, стала няёмка і літаральна праз сэкунду яна выправілася і сказала «Дзякуй». Мне было вельмі прыемна ад таго, што мне адказалі па-беларуску.

Але перайсьці на беларускую мову я пакуль ня змог. Прычын некалькі. Але галоўная ў тым, што ў мяне амаль няма сяброў, якія б гэта падтрымлівалі. У мяне ёсьць толькі адна беларускамоўная сяброўка, зь якой мы сустракаемся час ад часу.

А вам, Рэдакцыя, я хачу параіць аддаць адну старонку матэрыялам, у якіх будуць парады аб пераходзе на беларускую мову.

**Міхась, Курасоўшчына (Менск)**

**Ад Рэдакцыі.** Міхась, далучайцеся да беларускіх суполак і арганізацый — вам сьвет памяняецца.

### Царства — а не народ

**Нарэшце атрымаў маю «Ніву».** Гэта для мяне, як і «Народная воля», — глыток жывой вады. Даведаўся, як прайшоў Дзень Волі ў Менску. І вось аб чым мае думкі. Адна Бацькаўшчына, адна зямля. Але два сьцягі, і пад гэтымі сьцягамі — дзьве Беларусі. І там, і там — за Незалежнасьць. Але пад адзін сьцяг людзі прыйшлі па закліку сэрца, а пад другі — хто пад прымусам, хто проста паглядзець на канцэрт. Дык вось, наконт гэтага сказана ў Эвангельлі: «Не ўстаіць царства, што разьдзялілася само ў сабе». Менавіта царства, а не народ.

Хоць цяпер нашае грамадзтва падзеленае па ідэалягічных матывах, але гэтая заганная сыстэма абавязкова разваліцца. Савецкі Саюз разваліўся, бо ён быў шматнацыянальнай імпэрыяй, а Беларусь не разваліцца як краіна, проста зьнікне дыктатарскае кіраваньне.

Павал, Дзіма, Артур, хлопцы і дзяўчаты, што церпяць ганеньні, арышты, штрафы! Ня бойцеся, успомніце, што было напрыканцы існаваньня царскай Расеі. Тысячы маладых таксама сядзелі ў турмах, на катаргах, у высылках, і ў выніку тыранія пала. У вас двайная перавага ў тым, што вы зь імем Хрыста, таму ў нас з вамі ўсё атрымаецца. Бачыце, што Бацькаўшчына ў запусьценьні, ведайце, што час блізка (Мацьвея 24:15; 33–34).

Віншую вас са Сьвятам сьветлага Хрыстовага Ўваскрасеньня, здароўя вам, цярпеньня, веры. Жыве Беларусь!

**Сяргей Ціханавец, Бягомль**

### На чыім баку праўда

**Нядаўна я прачытала хрысьціянскі артыкул пастара Аляксея Лядзяева (Латвія).** Гэта так натхніла мяне і ўмацавала грамадзянскую пазыцыю! І я думаю, што гэты ўрывак натхніць усіх, хто выступае за праўду ў нашай краіне: «Нас сёньня наагул не хвалюе, шмат нас ці не. Нас хвалюе, на чыім баку Бог. І калі мы будзем ведаць, на чыім баку праўда, мы будзем ведаць, на чыім баку Бог. Таму што Бог на тым баку, дзе праўда. Нават калі нам ня ўдасца адразу рэфармаваць беззаконную сыстэму, нашым наканаваньнем будзе апазыцыя. І мая апазыцыя будзе маніфэставаць, што я не зьяўляюся часткай гэтай сыстэмы. Я ня зьліўся з большасьцю, ахвяраваўшы праўдай. Я выйшаў з гэтай большасьці ў імя праўды. Пытаньне ня ў тым, шмат нас ці мала. Пытаньне: на чыім баку праўда?».

І на мітынгу 25 Сакавіка 2007 году мне, як веруючай, было так прыемна чуць словы Аляксандра Мілінкевіча: «З намі праўда, з намі Бог!»

**Ірына Гоманава, Менск**

## ФЭСТЫВАЛЬ

### Дні беларускай культуры ў Кракаве

**23-25 красавіка ў Кракаве** (Польшча) пройдзе IV Фэстываль «Дні беларускай культуры». Сёлета яго назоў — «Пах вясновай вольнасьці».

Возьмуць удзел Аляксандар Мілінкевіч, Анжаліка Борыс, Алег Латышонак, Юры Хашчавацкі ды інш. У праграме — прэзэнтацыя новых кніг, у прыватнасьці, кнігі Алега Латышонка; паказы фільмаў «Плошча» і «Крыж Чарнобылю»; фотавэрнісаж Кацярыны Межавец, а таксама выступы гуртоў «Таварыш Маўзэр» ды «Троіца».

**СП**




## КАНЦЭРТ

### Я буду жыць!

**20 красавіка ў КЗ «Менск»** адбудзецца дабрачынны канцэрт, збор ад якога пойдзе на лячэньне дзяцей з ганамі сэрца. На сёньняшні дзень у сьпісе 5 дзяцей, якім неабходная апэрацыя за мяжой.

Арганізатар канцэрту — Аляксандар Патліс (гурт «Новы Ерусалім»).

Даведкі па т.: (017)203–31–82, 227–89–41

## ІМПРЭЗА

### Дзьве вечарыны ў адзін дзень

**20 красавіка (пт) а 14-й у будынку філялягічнага факультэту БДУ** (вул. Маркса, 31) у аўдыторыі 113 пройдзе прэзэнтацыя кніжнай сэрыі польскай клясыкі па-беларуску. Будуць прадстаўленыя зборы твораў Чэслава Мілаша, Зьбігнева Гэрбэрта, Рафала Ваячака, Паўла Гюле, Бруна Шульца. Выступяць перакладчыкі: Андрэй Хадановіч, Марыя Мартысевіч.

Зь філфакаўскай вечарыны аматары могуць проста перайсьці **ў Пушкінскую бібліятэку** (вул.Гікалы, 4), дзе **а 18.00** пачнецца прэзэнтацыя дзьвюхмоўнай анталёгіі маладой беларускай паэзіі «Пуп неба». Будуць аўтары — Андрэй Адамовіч, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Анатоль Івашчанка, Глеб Лабадзенка, польскі перакладчык Адам Паморскі і укладальнік Андрэй Хадановіч.

Уваход на абедзьве вечарыны вольны.

## КІНО НА DVD

### ЭЛЕМЭНТАРНЫЯ ЧАСЬЦІНКІ

(Elementarteilchen)

Драма, Нямеччына, 2006, 113 хв.

Рэжысэр: **Оскар Ролер**

У ролях: **Морыц Бляйтрой, Крыстыян Ульмэн, Мартына Гедэк, Франка Патэнтэ**

Матуля Бруна й Міхаэля была гіпі. І цяпер Бруна пускаецца ва ўсе цяжкія, а Міхаэль марыць зьмяніць чалавечыя гены...

Драма з футурыстычнымі намёкамі паводле рамана Мішэля Уэльбэка. «Срэбны мядзьведзь» Морыцу Бляйтрою на МКФ у Бэрліне.

Менск, Кісялёва, 12. Т.: 643–21–08

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Фляндрыя

**Фляндрыя** (Flandres)

Францыя, 2006, каляровы, 91 хв.

**Рэжысэр:** Бруна Дзюмон

**Ролі выконваюць:** Адэлаід Лёру, Самуэль Буадэн, Анры Крэтэль, Жан-Мары Брувар

**Жанр:** Драма

**Адзнака:** 6 (з 10)

Фэрмэр Дэмэстар корміць сьвіньняў, арэ зямлю і забаўляецца ў кустах зь сяброўкай дзяцінства. Дзяўчына без згрызотаў сумленьня сьпіць і зь сябрам Дэмэстра. Але абодвух адпраўляюць на вайну. У далёкай мусульманскай краіне героі будуць забіваць дзяцей, гвалціць жанчынаў — і ўцякаць ад партызанаў. Дэмэстар кіне параненым свайго сябра й вернецца да дзяўчыны, каб сказаць, што кахае яе.

Фільм канскага ўлюбёнца Бруна Дзюмона, які ўжо «дабіваў» публіку сваёй «Чалавечнасьцю» і «29 пальмамі» — аскетычна-мінімалісткі і незабыўна нудны.

Чвяканьне бруду пад ботамі рыфмуецца з хліпамі каітусных целаў, адстаронена-пастаральныя пэйзажы зьмяняюцца гвалтоўнымі сцэнкамі, а твары непрафэсійных актораў нічога не выяўляюць. Музыкі няма, гукі вязнуць у цішыні, словы амаль не патрэбныя.

Фэстывальны фільм філёзафа Бруна Дзюмона не разьлічаны на масавую аўдыторыю. Гэта кіно для крытыкаў, якія падзяліліся ў сваіх меркаваньнях.

Пры жаданьні ў карціне можна знайсьці мэтафізычны натуралізм, прыпавесьцевую глыбіню і сацыяльны пратэст, брэхтаўскую адстароненасьць і брэсонаўскі аскетызм, вышукаць намёкі на Дастаеўскага й Русо — і парадавацца за «каліграфічна-цялесную» фотагенічнасьць.

І крытыкам анічога болей не застаецца.

Бо як шчэ апраўдаць паўтары гадзіны безнадзейна згубленага часу?

Фільм дэманструецца ў менскім «Доме кіно» як радыкальная канская стужка.

## ВЫСТАВЫ

### Космас Івана Міска

Адкрылася пэрсанальная выстава з нагоды 75-годзьдзя заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Івана Міска. Яго скульптуру, графіку і жывапіс можна пабачыць **у Мастацкім музэі (вул.Леніна, 20) да 14 траўня**.

### Роднае

**18 красавіка а 17-й у Палацы мастацтваў** пройдзе прэзэнтацыя выставы **Пятра Сьвентахоўскага** «Роднае», на якой адбудзецца сустрэча яго вучняў, сяброў, усіх, каму цікавая яго спадчына. Большасьць твораў будзе ўзятая з калекцыяў Нацыянальнага мастацкага музэю, Музэю сучаснага выяўленчага мастацтва і фондаў Саюзу мастакоў.

## ТЭАТРЫ

### Опэра

*Вялікая заля Белдзяржфілярмоніі*

**20 (пт)** — І.Брамс «Нямецкі рэквіем».

### Купалаўскі тэатар

**28 (сб)** — «Вольга».
**20 (пт)** — «Я не пакіну цябе...».
**21 (сб)** — «Сымон-музыка».
**22 (ндз)** — «КІМ».
**23 (пн)** — «Смак яблыка».
**25 (ср)** — «Чычыкаў».

*ранішнія спэктаклі*

**22 (ндз)** — «Афрыка».

*малая сцэна*

**20 (пт)** — «Маці».
**22 (ндз)** — «Востраў Сахалін».
**23 (пн)** — «Апельсінавае віно».

### Тэатар беларускай драматургіі

**21 (сб)** — «Адэль».
**22 (ндз)** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**22 (ндз),** — «Нязваны госьць».
**24 (аўт)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».

# У нас родзяцца шчанюкі

Калі мы пераехалі ў новы дом — гэта было 20-га ці 21-га чысла — мы вельмі чакалі шчанюкоў ад сабакі, а сабака быў у гаспадара гэтага дому. То на наступны дзень, калі я ўжо прачнулася і проста ляжала і ўяўляла, што ў нас родзяцца шчанюкі, то так і было. Прыбягае мама і кажа запыханым голасам: «Шчанюкі радзіліся!» Я як адзелася, як паела, то як пабягу на двор. Але там аказаўся толькі адзін шчанюк. А пасьля прыехаў гаспадар, яго звалі Лёня, з сваёй жонкай, і трохі падаглядалі сабаку, а пасьля яны забралі яго дамоў, каб яна нарадзіла яшчэ шчанятаў. А потым, калі мама ўкладвала спаць аднаго сьпінагрыза, то я запісала гэты тэкст.

# У нас цёмная лесьвіца

Калі мы пераехалі ў новы дом — гэта было 20-га ці 21-га чысла — я пачала баяцца хадзіць па цёмнай лесьвіцы. Цяпер маме прыходзіцца ўключаць сьвятло. Я ўяўляю, як яна стамілася ад мяне.

# Усё трэба класьці на месца

Калі мы пераехалі ў новы дом — гэта было 20-га ці 21-га чысла —то я згубіла свой альбом, і вельмі злавала, і білася галавой у канапу. I не шукала, хоць я хацела знайсьці яго. А за паўгадзіны мама знайшла яго ў скрынцы, дзе ляжыць пыласос. Цяпер я знаю, што ўсё трэба класьці на месца або запамінаць, што куды я кладу.



# Як мяне тата ў школе забыўся

Калі я пайшла ў школу, дык пасьля сну мяне забыўся тата, і тады Ірына Юр’еўна ўстроіла гістэрыку, што як гэта яе не адпускаюць дадому. I тады мяне адвялі ў «Б» клас. А потым нас з Аланам адвялі ў ясьлі і там тут жа забралі Алана. А пасьля мяне пачалі даглядаць, і я папрасіла есьці. I мне далі хлеб, намазаны варэньнем, і хацелі заварыць чай. Але тут прыехаў тата і мяне забраў.

**Тома,**
**вучаніца 1 класу гімназіі № 23 г.Менску.**

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*красавік 2007*


Курт Вонэгут. Бойня №5, або Крыжовы паход дзяцей ..... 18

Павал Касьцюкевіч. Гурковы цукар ..... 20

Тацяна Барысік. Смачна есьці ..... 23

Павал Вусаў. Выбраны народ ..... 23

Вачыма дазымэтрысткі. Гутарка зь Віктарам Корзунам ..... 24


## год паэзіі


Сяржук Сыс. «Дзяўчына, якая з табою так шчыра гуляе…» ..... 26

Арцюх Германовіч. Вясна ..... 26



## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК

**Шукаем дзетак-дашкалятаў** для стварэньня беларускіх групаў зь верасьня на захадзе Менску (раёны Красны Бор—Сухарава—Захад), магчыма, ясельная і садаўская разнаўзроставая групы. Далучайцеся! З намі можна зьвязацца па тэл. 183–84–19, Лебедзі. Lebiedz@tut.by

### РЭПРЭСАВАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

**Падрыхтаваны** энцыкляпэдычны даведнік «Рэпрэсаваныя настаўнікі». Біяграфіі расстраляных або загінулых у сталінскіх канцлягерах настаўнікаў зь Беларусі. Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753–82–12, 755–25–61, (017) 211–09–53. Леанід Маракоў

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Абмен** культуралягічнай інфармацыяй, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. а/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў сяброўскія падарожжы. 22 красавіка «Палацы і сьвятыні» Ішкальдзь—Вольна—Сталовічы—Косава—Ружаны—Сынковічы—Слонім—Жыровічы. 29—30 красавіка Вільня—Меднікі—Трокі. Кантакты: GSM 622–57–20, 509–12–16, 110–19–28, 573–88–17, (017)292–54–58


## IN MEMORIAM

**На сайце nn.by разьмясьцілі свае спачуваньні** Дзьмітры Вінчэўскі, Аляксандар Фядута.

«Так здарылася, што я вучыўся ў Клецкай СШ у адным класе са старэйшым братам нябожчыка – маім сябрам Раманам, а зь Валерам у адным класе вучылася мая малодшая сястра Ніна ( Раман памёр зусім маладым гадоў дваццаць таму). Добрымі знаёмымі былі зь дзяцінства. Усіх некалі вучыла мая маці, якой зараз 82 гады». **Зямляк**

«Бывай, дарагі зямляча, хай пухам будзе табе родная беларуская зямля. Такой кампаніі, як у ёй, мы нідзе болей ня знойдзем...» **Л. Дз.**

Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне **«Таварыства беларускай школы»** аб'яўляе конкурс на ўдзел у міжнародным беларуска–польскім праекце **«Народны альбом»**. Рэпэтыцыі і паказы спэктакля адбудуцца ў Беларусі і Польшчы (Закапанэ, Гданьск, Варшава) падчас летніх вакацый.

На конкурс запрашаюцца навучэнцы 8 — 10 класаў, якія маюць акторскія і вакальныя здольнасьці.

Ахвотных узяць удзел у конкурсе запрашаем тэлефанаваць: 692–55–13, 333–15–56

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Але ці ж моцнае будзе гасударства толькі тым, што вельмі многа мецьме сваіх ваякоў? Не. У апошнюю вайну Расея выставіла 1 мільён 120 тысячаў войска, а японца там мала болей як паўмільёну было. І няшчасныя перажыткі гэтае вайны павінны наўсягды служыць знакам таго, што мала ўзяць маскаля, а мець трэба старанье і аб яго прасьвету. Яшчэ будзе скасавана ўстанова, каб салдаты ў дзеншчыкі ды ў «нестраявыя» брацъ. Бо брыдка ўжываць чалавека, прызначанага для абароны дзяржавы, для такіх работ.

**«Наша Ніва», №16, 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне.


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2241. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 18.04.2007.
Замова № 2148.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.